Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Выезд адрасу: іншагародняя	— 20 к.
кварталы	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шапарамі пасля тэксту	— р. 50 к.
За радок шапарамі шасцірок тэксту	1 р. — к.
За радок шапарамі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьцешная на 50 проц. даражэй.

Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Бесправоўны і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

НАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 69 (2257) Чацьвер 22-га сакавіка 1928 г.

Новыя выбрыкі.

У адным з апошніх нумароў нашае газэты паведамлялася аб адмове Амэрыкі прыняць савецкае золата.

Ці ўжо не фальшывае яно? Не,—самае праўдзівае. Але да гэтага часу ва купленыя ў Амэрыцы тавары (бавоўну, скуру, мэталі, машыны і інш.) мы плацілі амэрыканскімі грашыма (далярамі), якія прыходзілася купляць у замену на нашае золата ў Нямеччыне ці Англіі.

3 мая 1925 г. да лютага 1928 г. наш Дзяржбанк на замежных рынках прадаваў і купляў золата на агульную суму звыш 100 мілёнаў даляраў (200 міл. руб.). Больш паловы гэтых зваротаў было зроблена ў Англіі.

Наш гандаль з Амэрыкай пачынае досыць жвава разгортвацца. Зразумела, што пасрэдзікі, роля якіх, галоўным чынам, прыходзілася на долю Англіі, нявыгадны як для савецкага, так і для амэрыканскага гандлю.

Вось чаму Дзяржбанк і рашыў адаслаць у два амэрыканскія банкі «Чэйз Нэйшэнэль Банк» і «Эквітэбль Трэст Кампані» золата ў зьлітках на 5 мілёнаў даляраў, каб забясьпечыць у золаце нашы далейшыя разрахункі з амэрыканскімі камэрсантамі.

Банкі, у якіх паступіла савецкае золата, павінны былі яго перадаць прабірнай палаце, каб потым яно магло быць залічана на рахункі амэрыканскага дзяржаўнага банку.

І амэрыканскі прэзыдэнт, і амэрыканскі міністр замежных спраў у свой час заявілі, што з іх боку перашкод да ўвозу савецкага золата ў Амэрыку няма. І таму зусім нечаканым зьяўляецца забарона амэрыканскага міністра фінансаў, забарона прабірнай палаты прыняць савецкае золата.

На што-ж спасылаецца амэрыканскі міністр фінансаў? На закон, па якому прабірная палата Паўночна-Амэрыканскіх Злуч. Штатаў можа прыняць золата толькі ад уласьніка гэтага золата.

Значыцца, у амэрыканскага міністра фінансаў узьнікла сумненьне, ці зьяўляецца прысланае ў Амэрыку золата ўласнасьцю СССР?

Падставаю для гэткага «сумненьня» паслужыла, як гэта зараз высьветлілася, заява французкага ўраду, што гэта яго золата.

Заява гэта надзвычайна дзікая. З усіх бакоў.

Папершае, французкі ўрад заяўляе, што гэта—частка золата, якое ён крымаў да рэвалюцыі ў Расейскім Дзяржаўным Банку і якое ня было зьвернута Францыі. Але наш Дзяржбанк зусім не «наступнік» рапейшага Расейскага Дзяржаўнага Банку; апроч таго, на зьлітках ёсьць знак, што гэтае золата здабыта (і дакумантамі гэта пацьвярджаецца) у 1925 і 1926 г. г.

Калі-ж французкі ўрад ня хоча лічыцца з тым, што гэта за золата, неадкладна патрабуючы выплаты налічаных ім за СССР даўгоў, дык значыць ён ідзе поўнасьцю супроць сябе-ж.

У кастрычніку 1924 г. французкі ўрад абвясьціў аб прызнаньні ім СССР і зазначыў, што для вырашэньня ўсіх спрэчных пытаньняў аб узаемных абавязацельствах і даўгох арганізуецца спэцыяльная канфэрэнцыя. А да сканчэньня перагавораў праз гэтую канфэрэнцыю—адкладаюцца ўсе разрахункі паміж абодвымі дзяржавамі.

Чаму-ж цяпер Францыя забывае гэтую сваю пастанову, як толькі савецкае золата папала ў Амэрыку, і чаму яна не забывала гэтай пастановы раней, калі плацяжы з СССР у Амэрыку ішлі праз Англію?

Усё гэта і сапраўды магло-б здавацца незразумелым, калі-б адказам ня было ўзмацненьне цкавання супроць СССР у Францыі. Паміж асобнымі групамі французкай буржуазеі надзвычайна абвастраецца барацьба за адносіны да Савецкага Саюзу. У той час, як адна з іх дамагаецца шчыльнага гандлёвага супрацоўніцтва з СССР, другая дамагаецца зрыву франка-савецкіх перагавораў. Газэта «Волонтэ», адбіваючая інтарэсы першай групы, піша:

— Нацыяналісты (група французкай буржуазеі, варожая СССР) зрываюць перагаворы, якія могуць даць здавальненьне дробных трымацеляў старых расейскіх пазык. Мы не дапусьцім гэтага. Мы лічым неабходным у інтарэсах нашай краіны хутчэйшае ўрэгуляваньне пытаньняў мінулага і арганізацыю эканамічнага супрацоўніцтва на будучы час.

Варожая-ж СССР газэта «Авэнір» сьцьвярджае:

«Савецкі рэжым паленшыць немагчыма. Яго неабходна зьнішчыць, а дзеля гэтага ня трэба яму даваць грошай».

Французкі ўрад ня ўмее ўзяць на сябе поўнасьцю абарону інтарэсаў тэй ці іншай групы французкай буржуазеі. Адгэтуль і двоістасьць у яго чынасьці: з аднаго боку, ён вядзе перагаворы, з другога—сам жа іх зрывае.

Гэта адбілася і на справе з савецкім золатам, адасланым у Амэрыку. Справу гэту павінен будзе цяпер вырашыць амэрыканскі суд і сваёй пастановай не дапусьціць лішніх перашкод у разьвіцьці савецка-амэрыканскіх гандлёвых зносін.

ВОДГУКІ НА ЖЭНЕЎСКАЕ ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ЛІТВІНАВА.

ФРАНЦУСКІЯ МІЛІТАРЫСТЫ Ў АДЧАЮ.

ПАРЫЖ, 20-III. Французкі друк, абмяркоўваючы працу сэсіі падрыхтоўчае камісіі аб разброеньні, з расчараваньнем, а часам і з нэрвовасьцю падкрэсьлівае падтрыманьне Літвінава Нямеччынай і Турцыяй.

Жэнэўскі карэспандэнт «Пці Парызьен» піша: «Першае пасяджэньне камісіі было адзначана востраю агітацыйнаю прамоваю Літвінава і цікавай маніфэстацыяй салідарнасьці савецкае, нямецкае і турэцкае дэлегацыяй».

Не зважаючы на агалошанае амаль усім друкам паведамленьне агэнцтва Гаваса, што, як завяраюць амэрыканскія колы ў Жэневе, «Амэрыка не адкажа на заклік, з якім да яе зьвярнуўся Літвінаў». «Галуа» (рэакцыйная) у артыкуле пад загалоўкам „Змова ў пытаньні аб разброеньні»—востра нападае на Літвінава „за выкарыстаньне жэнэўскае трыбуны для злоснае антымілітарыстскае прапаганды, якая мае на мэце праз развал нацыянальных армій забясьпечыць гегемонію Масквы»;

НАСЬМЕШКІ ФАШЫСЦКАЕ ПРЭСЫ НАД ПАТЭНТАВАНЫМІ МІРАЛЮБЦАМІ.

РЫМ, 20-3. Італьянскі друк, не зважаючы на свае адмоўныя адносіны да савецкага праэкту аб разброеньні, не хавае свайго здаволеньня тым, што выступленьні Літвінава, Бэрнсдорфа і Рушды-бея паставілі ў цяжкае становішча прыхільнікаў разброеньня на словах.

„Джорнале д' Італія» і «Пополе д' Італія» падкрэсьліваюць, што «прыпёртыя да сьцяны выразнаю пастановаю пытаньня савецкай дэлегацыяй патэнтаваныя пацыфісты перапужаліся, ніхто з іх ня рызыкнуў узяць слова, і спрэчкі давялося адкласьці».

ПАГРОЗА АНГЕЛЬСКАГА НАПАДУ НА ПЭРСІЮ.

ЛЁНДАН, 17-III, З газэтных паведамленьняў відаць, што ваенныя мерапрыёмствы ангельцаў у султанаце Кавэйт (паўночна-заходняя частка Пэрсідзкае затокі) набываюць шырокія разьмеры. У бухце, дзе знаходзіцца горад Кавэйт, стаяць ангельскія вайсковыя судны—крэйсэр «Эмэрод» і шлюпкі „Цыклёмэн" і „Люпін". З гэтых суднаў высаджана 500 маракоў, якія разьбіты на атрады, заняўшыя галоўныя стратэгічныя пункты гораду. Памяшканьні, якія ў найлепшым стратэгічным становішчы, умацаваны. Пабудавана радыёстанцыя і аэрадром. Ангельская ўлада аддала загад, згодна якога ўсё мужчынскае жыхарства Кавэйту ад 12-ці гадоў падлягае прымусоваму вайсковаму навучаньню, нібыта на выпадак абароны гораду.

Парлямант выратаваў прэстыж цьвердалобых.

Спрэчкі ў палаце вобшчын яшчэ раз пацьвердзілі фальшывае пахаджэньне „ліста Зіноўева".

МАКДАНАЛЬД САМ СЯБЕ ВЫСЬЦЯБАЎ.

ЛЁНДАН, 20. Як паведамляе агэнцтва «Рэйтэр», на сёньнешнім пасяджэньні палаты вобшчын Макданальд, выступіўшы ў абарону рэзалюцыі рабочае партыі, у якой ёсьць патрабаваньне расьсьледаваць справу аб „лісьце Зіноўева", заявіў, што «ліст» гэты зьяўляецца палітычным машэньніцтвам, якое па сваёй мэце і замеры нельга параўнаць ні з чым у палітычнай гісторыі Англіі.

Адхіляючы настойліва паведамленьні, што ён сьвядома затрымліваў „ліст Зіноўева" і перашкаджаў яго апублікаваньню, Макданальд зазначыў, што ў апошнія месяцы ў Бэрліне, Парыжы здарыліся выпадкі, якія поўнасьцю даказалі, што ў тую пору ў кожнай эўрапейскай краіне было шмат падробленых дакумантаў.

Апрача таго, нядаўна ў Амэрыцы разглядалася справа, якая выявіла, што работнікі амэрыканскага ўраду былі ашуканы такім-жа самым чынам.

Той факт, што ўрад пры дапамозе сродкаў такога роду змог атрымаць уладу, зьявіўся сур'ёзным ударам для дэмакратычных прынцыпаў сучасных выбараў. Грамадзтва дамагаецца, каб яно было забясьпечана ад гэтага ў далейшым.

ФАЛЬСІФІКАТАРСКАЯ ПРАМОВА БАЛЬДВІНА.

З адказам Макданальду ад імя ўраду выступіў прэм'ер Бальдвін. Ён заявіў, быццам, паводле вестак ангельскага ўраду, Чычэрын заявіў сваім калегам у Маскве, што ён пытаў Зіноўева аб лісьце, і Зіноўеў прызнаў, што ліст быў пасланы кампартыі ў Англію, але дзівіўся, як ангельскі ўрад змог атрымаць копію. Зіноўеў вытлумачыў гэта здрадніцтвам, якое зроблена альбо ў Маскве, альбо ў Лёндане. Зіноўеў зазначыў, што апублікаваны тэкст у некаторых мясцох некалькі пераблытан, на што Чычэрын заўважыў, што нельга зьвінавачваць у гэтым ангельскі ўрад, бо гэта будзе раўназначна прызнаньню сапраўднасьці лісту, і што адзіны выхад—абвясьціць ліст фальшывым.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ДЭПУТАТАЎ РАБОЧАЕ ФРАКЦЫІ.

Дэпутат рабочае партыі Мэкстон заявіў, што як расейскія, так і ангельскія камуністы выказалі гатоўнасьць адкрыць усе свае архівы і абсьледаваць усе дакуманты.

Як устанавіла рабочая партыя, «ліст Зіноўева» зьяўляецца дакумантам, сфабрыкаваным прыяцелямі прэм'ера.

Камуністычны дэпутат Саклатвала заявіў, што прамова Бальдвіна зьяўляецца адною фальсіфікацыя.

Пасьля гэтага выступіў галоўны пракурор Хог, які заявіў, што ўрад супроць расьсьледваньня, бо яно зможа выкрыць для рускіх крыніцы інфармацыі ангельскага ўраду.

ВЫНІКІ ГАЛАСАВАНЬНЯ.

ЛЁНДАН, 19-3. Пасьля доўгіх спрэчак, у якіх узялі ўдзел Макданальд, Бальдвін, Мэкстон, Саклатвала і інш., палата вобшчын большасьцю 326-ці галасоў проці 132-х адхіліла рэзалюцыю рабочае партыі з патрабаваньнем назначыць сьледзтва аб паходжаньні т. зв. «ліста Зіноўева».

Паведамленьне ТАСС.

ТАСС упаўнаважаны Народным Камісарам па Замежных Справах заявіць, што ўсе ссылкі ангельскага прэм'ера Бальдвіна на быццам зробленыя дзеячамі СССР заявы, пры дапамозе якіх Бальдвін прабуе заднім числом даказаць сапраўднасьць „ліста Зіноўева", зьяўляюцца адною хаусьліваю выдумкаю. Складанасьць гэтае выдумкі робіцца асабліва відавочнай, калі прыпомніць хоць-бы тую акалічнасьць, што савецкі ўрад зараз-жа пасьля зьяўленьня фальшывага «ліста Зіноўева» запрапанаваў ангельскаму ўраду стварыць камісію ў любым складзе для расьсьледаваньня аб паходжаньні гэтага „дакумэнту".

Як відома, ангельскі ўрад на такую прапанову не згадзіўся.

„ЗАДАЧА БАЛЬДВІНА ПАЛЕГЧАНА МАКДАНАЛЬДАМ".

ВОДГУКІ ПРЭСЫ НА СПРЭЧКІ Ў ПАЛАЦЕ ВОБШЧЫН.

ЛЁНДАН, 20-III. Ангельскі друк жвава абмяркоўвае спрэчкі ў палаце вобшчын наконт «ліста Зіноўева». Прыгэтым кансэрватыўныя газэты падкрэсьліваюць, пераважна, асабісты правал Макданальда, які апынуўся ў безнадзейным становішчы: яму даводзілася адначасна апраўдваць як сваю ранейшую веру ў сапраўднасьць «ліста Зіноўева», так і яго сучасныя «западозраныя адносіны» да гэтага дакуманту.

Лібэральны друк таксама востра крытыкуе прамову Макданальда, называючы яе „цьмянаю і бяссувязнаю", і заўляе, што гэтая прамова значна палегчыла задачу Бальдвіна.

«Дэйлі Геральд» задае запытаньне: «Калі, як кажа Бальдвін, ангельскі ўрад верыць, што «ліст Зіноўева» быў атрыманы ангельскай камуністычнай партыяй, дык чаму Мак-Манус, якому гэты «ліст», нібыта адрасаваны, не пакараны судом па абвінавачаньні ў мяцежнай дзейнасьці».

Крызіс польска-нямецкіх дачыненьняў.

НОВЫ ПОЛЬСКІ ЗАКОН АБ ЧУЖАЗЕМЦАХ Ў ПРЫГРАНІЧЧЫ.

ВАРШАВА, 20-3. Агалошан дэкрэт прэзыдэнта наконт правоў чужаземных грамадзян у прыгранічнай паласе, згодна якога чужаземцы маюць права набываць і атрымліваць у спадчыну нярухомую маемасьць у прыгранічнай паласе кожны раз са спэцыяльнага дазволу ўраду.

ЗАКОН ВЫКЛІКАЎ НЕЗДАВОЛЕНЬНЕ Ў НЯМЕЧЧЫНЕ.

БЭРЛІН, 30-III. Бэрлінскі друк востра крытыкуе новы дэкрэт польскага прэзыдента наконт становішча ў прыгранічных абласьцёх. Пытаньне аб прававых нормах у прыгранічнай паласе адыгрывае першарадную ролю ў польска-нямецкіх эканамічных перамовах.

Блізкая да Штрэзэмана «Тэгліхе Рындшау» піша: «У зьвязку з агалошэньнем дэкрэту, у Бэрліне лічаць пэрспэктывы далейшых перамоў аб утварэньні гандлёвага ўгавору з Польшчаю няспрыяючымі».

ГАНДЛЁВЫЯ З ПОЛЬШЧАЮ ПЕРАМОВЫ КЕ АДНОВЯЦЦА.

БЭРЛІН, 20-III. „В. Ц. Амітаг" друкуе інсьпіраванае паведамленьне, згодна якога ў нямецкіх палітычных колах ня бачаць пакуль ніякай магчымасьці спадзявацца на аднаўленьне польска-нямецкіх гандлёвых перамоў у больш ці менш блізкай будучыні.

Далей у паведамленьні гаворыцца: „Ва ўзаемадачыненьнях між Польшчаю і Нямеччынаю будзе цягнуцца безугаворнае становішча. Каб зноў стварыць грунт для абмеркаваньня гаспэдарчых пытаньняў, патрэбны будуць напярэдадні цяжкія дыпляматычныя перамовы. Абяцаньні, дадзеныя Залескім Штрэзэману пры перамовах між імі ў Жэневе, засталіся ня выкананымі. Новы кантакт між Польшчаю і Нямеччынаю наўрад ці магчымы раней чэрвеня, г. зн. ён можа мець месца толькі пасьля выбараў у рэйхстаг".

КАМУНІСТЫЧНЫ ЎРАД НА ПОЎНАЧЫ ГУАНДУНІ.

ШАНХАЙ, 20-III. У Шанхай прыехаў кантонскі дыктатар Лі-Ці-Сін.

У гутарцы з супрацоўнікам газэты «Сін-Вэнь-Бао» Лі-Ці-Сін заявіў, што яго прыезд у Шанхай прысьвечан пытаньням арганізацыі паўночнае экспэдыцыі і рэарганізацыі гуандуньскага войска. Прыгэтым Лі-Ці-Сін зазначыў, што гуандуньская войска ня можа браць удзелу ў паўночнай экспэдыцыі, бо яно „занята барацьбою з камуністамі"; таму Лі-Ці-Сін адмовіўся ад пасады начальніка штабу паўночнае экспэдыцыі, прапанаванае яму Чан-Кай-шы.

Лі-Ці-Сін прызнаў, што рэвалюцыйны ўрад, кіруемы камуністамі, да гэтае пары існуе ў павеце Хайфынь і пад яго загадам у розных райёнах Гуандуньскае правінцыі ёсьць халя 10 тысяч войска. Закранаючы ўмовы дзелавога жыцьця Кантону, Лі-Ці-Сін заявіў, што рынак у Кантоне, зруйнаваны ў дні сьнежаньскага паўстаньня, адноўлен на 90 проц.; аднак фінансавы крызіс у горадзе да гэтага часу не ліквідаваны.

„САМАЯ ВЯЛІКАЯ Ў ГІСТОРЫІ КІТАЮ».

ШАНХАЙ, 18-III. Ваенныя дзеячы навкінскага ўраду заяўляюць, што падыходзячая паўночная экспэдыцыя будзе „самаю вялікаю вайною ў гісторыі Кітаю». Згодна падлікаў нанкінскіх вайсковых колаў, на ўсіх фронтох будзе згуртавана больш 700 тысяч салдат.

КРЫТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА РУМЫНСКАГА ЎРАДУ.

ВОСТРАЕ ВЫСТУПЛЕНЬНЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-СЯЛЯНСКАЕ ПАРТЫІ ПРОЦІ БРАТЫЯНУ.

ВЕНА, 20-III. Як паведамляюць з Бухарэсту, Маніу (лідэр нац.-сял. партыі) учора пасьля паведаньня рэгенцкае рады зрабіў даклад аб вынінах наведаньня цэнтральнаму камітэту нацыянальна-сялянскае партыі нават у выпадку новае забароны яго ўладаю.

ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ АРЫШТЫ.

ВЕНА, 20-III. Згодна паведамленьняў з Бухарэсту, у Орадэа-Маре (буйны прамысловы і гандлёвы цэнтр на паўночным заходзе) адбылося каля 40 арыштаў абвінавачваюцца ў камуністычнае пэрадамленьні аб арышты ў горадзе адбудуцца ...х адзначаюць, што ...кампанію проці на...цягнуць увагу гра...пяваючых буйных ...алошнімі падзеямі.

...амуністам.

...а розныя тэрмі...д 2-х да 7-мі ...ваемых засу...ьне італьян...й партыі» да ...розе ад паў... 10 абвінавач...

...а, які знахо... вылучана і не ...налам.

...льдэмарас.

...ізбарзе, старшы...ні будзе прэм'ер

ПАЧАТАК ПРАЦЫ ПОЛЬСКАГА СОЙМУ.

ППС І «ВЫЗВАЛЕНЬНЕ» БАЙКАТУЮЦЬ ПЕРШЫ СХОД СОЙМУ.

ВАРШАВА, 20-III. Адчыненьне сэсіі новага польскага сойму адбудзецца 27-га сакавіка ў палацы прэзыдэнта.

У знак пратэсту проці таго, што сэсія адчыняецца не ў памяшканьні сойму, дэпутаты ППС і „Вызваленьня" ня возьмуць удзелу ў першым пасяджэньні.

ЦУДОЎНАЕ ПАЛЯВЕНЬНЕ.

Выбраны ў паслы сойму па Кракаву кансэрватар праф. А. Кжыжаноўскі ўступіў у партыю працы.

ПАГРОЗА ТРАМВАЙНАЕ ЗАБАСТОЎКІ.

Служачыя лодзінскіх трамваяў выставілі дамаганьні падвышкі заработнай платы і ў выпадку нездаволеньня іх вымаганьняў да 20 сакавіка г. г. пагражаюць забастоўкай.

УЗРОСТ ДАРАГОЎЛІ Ў ПОЛЬШЧЫ.

Паводле даных, надрукаваных у «Статыстычных Ведамасьцях» узрост дарагоўлі ў сьнежні 1927 г. у параўнаньні з 1926 г. выявіўся у надвышцы ў 46,3 пр.

* * *

Варшаўская краўцы, з прычыны ўзросту дарагоўлі, дамагаюцца падвышкі платы на 20 проц. У разе адмовы—краўцы пагражаюць забастоўкай.

БЮДЖЭТ ПОЛЬШЧЫ НА 1928-29 г.

Даходы на 1928-29 год вылічаны ў разьмеры 2.525.702.596 злотых, а выдаткі—у 2.478.370.242 зл. Даходы перавышаюць выдаткі на 47.332.354 зл. Бюджэт 1928-29 г. вышэйшы за бюджэт 1927-28 г. на 600 млн. злотых. Павялічэньне даходаў прадбачыцца ад падвышкі даходаў ад манаполяў.

ЯШЧЭ АБ ЗАБОЙСТВЕ ПРАВАКАТАРА ГУРЫНА.

(Інфармацыі „Глосу Праўды").

У той час, як віленскія газэты былі сканфіскаваны за зьмяшчэньне інфармацый аб забойстве Гурына, варшаўская поўурадавая газэта „Глос Праўды" і спачуваючая дзейнасьці ўраду «Кур'ер Варшаўскі» зьмясьцілі аб гэтым факце інфармацыі і ня былі сканфіскаваны.

„Глос Праўды", між іншым, паведамляе, што:

«Гурын часта бываў у кавярні Тамашэвіча па Ягелёнскай вул.

У крытычны дзень каля 11-ай гадз. ночы Тамашэвіч заўважыў 3 асобы, якія размаўлялі перад кавярняю, сярод іх быў Гурын. Раптам грукнуў рэвальвэрны стрэл, адчыніліся дзьверы і ў кавярню ўвайшоў Гурын. Ступіў пару крокаў, абацёрся аб печ і, не гаворачы ні слова, асунуўся на падлогу. У гэты момант у кавярню ўбег адзін з размаўляўшых з ім і яшчэ тры разы стрэліў у Гурына».

ГАЗЭТЫ З АДНЫХ АБВЕСТАК.

Як ужо паведамлялася, некаторыя віленскія газэты за зьмяшчэньне інфармацый аб забойстве вядомага правакатара Гурына былі сканфіскаваны. У знак пратэсту проці канфіскацыі, газэты „Кур'ер Віл.", „Дзеньнік Віл." і «Слово» пастанавілі выходзіць у працягу трох дзён бяз усякага інфармацыйнага тэксту.

У АПОШНІ ЧАС.

БРЫТАНСКІ УРАД ПРЫПЕРТ ДА СЬЦЕНКІ.

ЁН СЬВЯДОМА ЎХІЛЯЕЦЦА АД РАСКРЫЦЬЦЯ ЦЯЖКАЙ ДЛЯ ЯГО ПРАЎДЗІВАСЬЦІ.

Заява т. Чычэрына прадстаўнікам друку з прычыны выступленьня Бальдвіна ў палаце вобшчын па справе „ліста Зіноўева".

У гутарцы з прадстаўнікамі друку з прычыны выступленьня Бальдвіна ў палаце вобшчын 19 сакавіка Народны Камісар па Чужаземных Справах Чычэрын заявіў:

„Пан Бальдвін зрабіў шэраг паведамленьняў аб мнімых заявах як маіх, так і т. Зіноўева, і мнімых пастановах савецкага ўраду на гэтай справе. Заяўляю катэгарычна, што ў гэтых паведамленьнях пана Бальдвіна няма ні слова праўды. Яны зьяўляюцца ад пачатку да канца прастымі вымыслами, вусім ня маючымі ніякага запраўднага абгрунтаваньня, прытым носяць паклёпны характар і зьяўляюцца зьнявагай для членаў нашага ўраду. Але пры гэтым сам пан Бальдвін ухітрыўся выкрыць абманнасьць сваіх заяў.

У яго выступленьні масца, між іншым, гэткая непагоджанасьць, якая яскрава кідаецца ў вочы, між яго сьцьвярджэньнямі і агульнавядомымі фактамі. У перадачы ангельскага афіцыйнага радыё пан Бальдвін кажа, што, прыблізна, праз месяц пасьля зьяўленьня так званага «ліста Зіноўева», я быццам паведаміў сваім калегам, што арыгінал ліста зьнішчан, і савецкі ўрад можа спакойна вымагаць расьсьледваньня.

Калі мы зьвернемся к дакумантам па гэтай справе, дык убачым, што нота пана Грэгоры, дадаткам да якой быў так званы «ліст Зіноўева», была пададзена Ракоўскаму 24 кастрычніка 1924 году, і што зараз-жа па атрыманьні з Лёндану падрабязнага зьместу ноты пана Грэгоры і дадатку к ёй, наш урад тэлеграфаваў Ракоўскаму, што ён рашуча, катэгарычна прапануе перадаць устанаўленьне таго факту, што так званы „ліст Зіноўева" ад 15 верасьня зьяўляецца падробкай, трацейскаму суду. Гэта прапанаваньне было перададзена Ракоўскім міністэрству па чужаземных справах у ноце 27-X, 24 году.

Дзе-ж месячны тэрмін? Пан Бальдвін выдумаў месячны тэрмін, пасьля якога, быццам, савецкі ўрад рашыўся запрапанаваць расьсьледваньне справы трацейскім судом, у той час, як запраўды гэта прапанаваньне нашага ўраду было зроблена зараз-жа пасьля атрыманьня намі паведамленьня аб прадстаўленьні фальшыўкі Ракоўскаму.

Нота Ракоўскага ад 27 кастрычніка ня была прынята брытанскім урадам па тэй аснове, што ў ёй было патрабаваньне аб пакараньні вінаватых чыноўнікаў, замешаных у фабрыкацыі фальшыўкі.

У лісьце ад першага лістапада Ракоўскі падкрэсьліў справядлівасьць гэтага патрабаваньня з прычыны вялікай маральнай шкоды, учыненай нотай пана Грэгоры ад 24 кастрычніка.

28 лістапада 1924 г. Ракоўскі ад імя нашага ўраду ў адрасаванай пану Чэмбэрлену ноце выказаў крайняе здзіўленьне з прычыны таго, што брытанскі ўрад, адхіліўшы прапанаваньне аб праверцы інкрыміінуемага дакуманту незацікаўленым трацейскім судом, заяўляе галаслоўна, па аснове нікому ня ведамых вестак, аб запраўднасьці дакуманту. Ракоўскі пры гэтым заявіў, што надобныя недаказаныя заявы савецкі ўрад прымаць ня лічыць магчымым і што «савецкі ўрад з свайго боку прымушан вымагаць, як адзінага спосабу незацікаўленага вырашэньня пытаньня, арбітражу, выкладзеным у ноце ад 27 кастрычніка».

Пасьля гэтага, калі ў палаце вобшчын брытанскі міністр унутраных спраў заявіў, што доказы запраўднасьці так званага «ліста Зіноўева» ня могуць быць даедены з прычыны боязьні за безапаску асобы, якая даставіла брытанскаму ўраду гэты дакумант, Ракоўскі, па даручэньні нашага ўраду, нотай ад 21-га сьнежня на імя пана Чэмбэрлена заявіў, што савецкі ўрад гатоў гарантаваць бясспэшкодны выезд з СССР кажнай асобе. Аднак, пан Чэмбэрлен знайшоў магчымым адказаць на гэта толькі голай заявай, што ня мае нічога дадаць к сваёй рапейшай ноце.

Цяпер брытанская рабочая партыя запрапанавала брытанскаму габінэту з свайго боку назначыць расьсьледваньне на справе аб так званым «лісьце Зіноўева». Брытанскі габінэт адхіліў гэта прапанаваньне таму, што расьсьледваньне бязумоўна даказала-б фальшывасьць гэтага дакуманту. Зрабіць гэта расьсьледваньне было-б тым важней, што за мінулыя тры з паловай гады сталі вядомымі дужа каштоўныя крыніцы запраўднага паходжаньня гэтай фальшыўкі, але, разумеецца, ангельскі ўрад тым больш баіцца расьсьледваньня, чым мацней даказацельства падробкі «ліста».

У часе працэсу ў савецкім судзе зґатавіцеля фальшывак, Дружылоўскага, з паказаньняў апошняга, зафіксаваных у стэнаграме суда, вывялася, што ён мае весткі аб тым, як быў сфабрыкаваны ў Бэрліне так званы «ліст Зіноўева». Яго паказаньні праліваюць надзвычайна яскравы сьвет на гэту справу. Дружылоўскі ў Бэрліне выконваў даручэньні польскага капітана Пацюркоўскага, зьвязанага, па яго словах, і з іншымі разьведкамі. У сваіх паказаньнях Дружылоўскі паведам ў падрабязны фактычны матар'ял аб зґатаўленьні „ліста Зіноўева" расейскімі эмігрантамі Жамчужнікавым, Бельгардтам і Гуманскім, працаваўшымі як у Пацюркоўскага, так і ў ангельскай разьведцы, прычым Жамчужнікаў перадаў Дружылоўскаму, што праэкт „ліста Зіноўева» ўкладаўся на яго кватэры Бельгардтам і Гуманскім. Па вестках, якія маюцца, загатоўлены ў Бэрліне «ліст Зіноўева» быў перададзены адначасна некалькімі шляхамі ў Лёндан. Надзвычайна дакладныя і падрабязныя паказаньні Дружылоўскага рашуча адхіляюць абманную вэрсію ангельскага ўраду аб запраўднасьці так званага „ліста Зіноўева».

Пазьней, у студзені гэтага году, у часе працэсу Шрэка перад лейпцыгскім вярхоўным судом, вядомы пацыфіст Мэртэно паказаў пад прысягай, што жыўшы ў Жэневе ангельскі публіцыст перадаў яму, што так званы «ліст Зіноўева» быў сфабрыкаваны польскім агентам Пацюркоўскім, які працаваў у цесным кантакце з падсудным Шрэкам.

Калі-б было зроблена расьсьледваньне гэтай справы, дык магчы-б быць прадстаўлены і інш. доказы таго, што менавіта ў зазначаным месцы сфабрыкавана фальшыўка, якая завецца «лістом Зіноўева».

Але брытанскі габінэт ад гэтага расьсьледваньня ўпарта ўхіляецца. Між тым, нават у саліднай газэце «Манчэстэр Гардыян», у нумары ад 23 мая 1927 г., з некаторымі амаўленьнямі, аднак, з належнай яскравасьцю, было зазначана, што гэта фальшыўка, падобна іншым паддзельным дакумантам, была зроблена ў Бэрліне, прычым газэта дабавіла: „ёсьць грунт думаць, што гэты ліст паходзіў з польскай крыніцы ў Бэрліне". Гэтаму запраўднаму паходжаньню фальшыўкі пан Бальдвін супроцьставіць вэрсію аб яе атрыманьні «джэльтмэнам з Сіці», панам Імтэрнам ад джэльтмэна, які блізка стаіць к камуністам. Яскравы сьвет на палажэньне гэтага другога «джэльтмэна» пралівае той факт, што гэтаму «джэльтмэну» т. Зіноўеў вядомы, як Апфэльбаум. Між тым, Апфэльбаум ня ёсьць прозьвішча т. Зіноўева; пад гэтым прозьвішчам яго ведалі разьведчыкі розных краін. Цяпер усім вядома, што яго прозьвішча Радамысльскі. Вышэйпамянёны «джэльтмэн» тым самым паказаў бязумоўна сваю прыналежнасьць к разьведцы.

Брытанскі ўрад прыпёрты да сьценкі і сьвядома ўхіляецца ад раскрыцьця цяжкай для яго праўдзівасьці. Ён апэрыруе мэтадамі, якія ўжываліся ў стары час у рэлігійных судох і іезуітамі, якія былі заўсёды гатовы высунуць супроць тых, каго яны хацелі загубіць, самыя страшныя абвінавачаньні, але бяз усякіх доказаў. Іезуіты патрабавалі, каб ім на слова верылі. Але калі выходны пункт ёсьць абавязацельства верыць усякаму сьцьвярджэньню бяз доказаў, калі лічыцца магчымым каго напала і як напала ачарніць, дык магчымасьць добрых адносін з падобнымі іезуітамі загадзя адхіляецца».

У Заходняй Беларусі.

АРЫШТЫ Ў ЛІДЗЕ.

„Глос Праўды" паведамляе, што ў Лідзе арыштован „увесь камітэт кампартыі Зах. Беларусі». Арыштаваны: Н. Юшчынскі, К. Матусэвіч, П. Пупко, К. Баярскі, С. Фрыдман, І. Гецоўскі, І. Любецкі, Б. Троцкі, І. Войткім, І. Баярскі і А. Любецкі.

«УТРО» ПЕРАЖЫВАЕ КРЫЗІС.

Віленская расейская газэта „Утро"—орган „Русского Народного Об'единения" перастае быць органам гэтага „Об'яднаньня", што зьяўляецца вынікам нефартунных акцыі расейцаў на выбарах

ЗАБАСТОЎКІ.

У Вільні ўжо досыць доўга цягнецца забастоўка шаўцоў, якія жадаюць 30 проц. падвышкі платы. 16-га сакавіка г. г. бастуючыя шаўцы выбілі шыбы ў некалькіх крамах абутку, а таксама выбілі штрэйкбрэхераў, якія згадзіліся на 15 проц. падвышкі. Мітынг, скліканы забастоўшчыкамі, быў разагнаны паліцыяй.

ПАЖАР МЛЫНА ГР. ТЫШКЕВІЧА.

У Вільні згарэў вялікі млын гр. Тышкевіча. Млын гэты ўжо ў працягу некалькіх гадоў знаходзіцца ў распараджэньні вайсковай улады. Згарэлі запасы мукі, якія зьяўляліся ўласнасьцю войска. Выратаваць нічога не ўдалося. Прычына пажару ня выкрыта

У Саюзных Рэспубліках.

79.000 новых ленінцаў.

МАСКВА, 20-III. Статыстычны аддзел ЦК УсеКП(б) падрахаваў папярэднія статыстычныя вынікі кастрычнікаўскага прызыву. З 120.654 падаўшых заявы, прынята ў партыю 79.379 ч. 85 проц. прынятых—фабрычна-заводзкія і транспартныя рабочыя, у ліку якіх 20 проц. з вытворчым стажам звыш 10-ці гадоў.

Гадавы пленум Камуністычнае Акадэміі.

МАСКВА, 21-3. 20-га сакавіка адбыўся гадавы пленум Камуністычнае Акадэміі. Пленум заслухаў даклады т. т. М. Н. Пакроўскага і В. П. Міліюціна аб дзейнасьці Акадэміі і пляне яе працы на 1927-28 г., а таксама абраў прэзыдыум Акадэміі.

Сёлета Акадэмія будзе распрацоўваць праблемы, зьвязаныя з сацыялістычным будаўніцтвам у СССР, і, у асобку, праблемы клясавае дыфэрэнцыяцыі вёскі, пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі і г. д. Апроч таго, будзе распачата вывучэньне праблемы калектывізацыі сельскае гаспадаркі і тэарэтычная распрацоўка пытаньняў культурнае рэвалюцыі. Пленум зацьвердзіў плян працы Акадэміі на бягучы год і прызнаў патрэбным узмацніць барацьбу Акадэміі з буржуазнымі і дробнабуржуазнымі напрамкамі ў галіне тэорыі.

Пленум, на падставе статуту Акадэміі, **выключыў з ліку сяброў Акадэміі** водлуг меркаваньняў ідэалёгічнага характару **Е. А. Праабражэнскага, Радэка, Ракоўскага, В. М. Сьмірнова і Троцкага. Новымі сябрамі Акадэміі залічаны т. т. І. К. Лупал, К. Цэткін, Тальгеймер і М. Левін.**

Новы прэзыдыум Акадэміі абраны з 14-ці асоб, у ліку якіх: Бухарын, Варга, Крыніцкі, Мілюцін, Асінскі і Пакроўскі.

Шкоднае галавацяпства.

ХАРКАЎ, 20-3. Абсьледаваньне, праведзенае Мікалаеўскаю РСІ, выявіла бестаспадарчасьць, блізкую да злачынства, на заводзе імя Марты ў Мікалаеве. Робячы заграніцаю заказы і купляючы абсталяваньне, завод ня ведаў, як, калі і дзе зможа яго выкарыстаць. Некалькі месяцаў назад з заграніцы прыбылі машыны, якія і да гэтае пары не выкарыстоўваюцца. Машыны доўга валяліся на заводзе і пакрыліся іржою. Варстаты ад машын, трапіўшыя ў цэхі, выкарыстаны толькі на 25 проц. Некаторыя заграничныя варстаты не адпавядаюць заяўкам і зьяўляюцца нягоднымі.

Пашырэньне вырабу абутку.

МАСКВА, 16-3. У будучым годзе памячаецца пашырэньне вырабу абутку на дзяржаўных скураных фабрыках да 37,3 мільёнаў пар, з іх ня менш 10 міліёнаў пар сялянскага абутку. Некаторыя фабрыкі мяркуецца перавесьці на 2-хзьменную працу пры 7-мігадзінным рабочым дні.

Бытавая пляма.

СЯМІПАЛАЦІНСК, 16-III. У прысутнасьці вялікага ліку рабочых разгледжана на паказальным судзе цікавая бытавая справа. Дыхцяр, партыец з 11-цігадовым стажам, ранейшы парабак, узьнімаючыся ўсё вышэй па службе, стаў судовым працаўніком губэрскага абхвату. Адпаведна павышэньню па службе ў яго зьмяншаліся пачуцьці да сваёй сям'і, якая складалася з жонкі, дачкі і сына. Ён папракаў іх у адсталасьці і хутка пачаў востра зьдзекавацца над сваёю жонкаю, якая, ня вытрымаўшы ўсяго гэтага жаху, застрэлілася. Дыхцяр пабраўся з інтэлігентнаю партыйкаю з 9-цігадовым стажам, Тамілаваю. Умовы жыцьця дзяцей, якія сталі ўжо камсамольцамі, пагоршыліся. Урэшце бацька і мачыха выгналі абодвых на вуліцу. Дачка ня вытрывала гэтага і атруцілася.

Выключаныя з партыі Дыхцяры аддадзены пад суд, які засудзіў абодвых на 4 гады астрогу з суровым адмежаваньнем.

Падрабязнасьці шахцінскай контр-рэвалюц. змовы.

КАЛАДУБЫ І ГАЎРУШОНКІ НА СЛУЖБЕ Ў ЧУЖАЗЕМНАЙ БУРЖУАЗЕІ.

„Госьці" з эміграцыі ў Шахцінскім раёне.

Мы атрымалі некаторыя падрабязнасьці контр-рэвалюцыйнай змовы ў Шахтах і характарыстыку галоўных удзельнікаў гэтай змовы—групкі здрадніка-інжэнэраў і тэхнікаў, арыштаваных паўночна-каўкаскім АДПУ.

Галоўнымі ўдзельнікамі змовы зьяўляюцца Амяльлян, Кірыла і Андрэй Каладубы.

Амяльлян Каладуб—ранейшы ўласьнік капальняў. Гэта—стары чорнасоценец, царскі ахраньнік і шпік, белагвардзеец да мозгу касьцей. Ён выслужыўся з абшарніцкага аб'езчыка ў кіраўніка Данецка-Грушаўскіх капальняў. Калі Каладуб папаў на капальні, ён пацягнуў за сабой усю сваю сям'ю—брата Андрэя, пляменьніка Кірыла,—з Тураўскай станіцы, блізкіх і далёкіх сваякоў—тэхнікаў Бабенка, Матусенка і інш.

У 1905 годзе Каладубаўская сямейка дапамагала царскім жандарам прыдушаць рабочыя непарадкі ў шахтах. У 1916 годзе Каладуб сам зрабіўся гаспадаром. Разам з Самойлавым ён атрымаў капальню пад фірмай «Антроцыт». У 1918 г. Амяльлян Каладуб разам з сваім прыцелем Гаўрушэнка дапамагаў дэнікінскай контр-разьведцы зьбіваць рабочых. Гаўрушэнка браў у рукі «сьвінчатку» і біў палонных чырвонаармейцаў. Пры белых кватэра Каладуба была аддзяленьнем контр-разьведкі. Тут нават жыў памоцнік начальніка шахцінскай контр-разьведкі—ротмістр Сазонаў. Тут зьбіраліся вярхі белагвардзейскай афіцэрыны. Тут арганізоўвалі п'янкі і оргіі. Калі белым трэба было ўцякаць, брат Каладуба, Андрэй, перадаў сваяком 16-гадовай дзяўчыны, якая ў яго служыла, большасьць каладубаўскіх рэчаў. Брат гэтай дзяўчыны быў у шэрагах Чырвонай арміі. У Шахтах чырвонаармейцы заставаліся нядоўга. Калі вярнуліся белыя, Андрэй Каладуб забраў у сваякоў дзяўчыны свае рэчы. Але адной сукенкі не хапіла, і за прапаўшую зялёную аксамітную сукенку «самой» пані Каладуб дзяўчына была растраляна.

Андрэй Каладуб усімі спосабамі дапамагаў белым «ратаўнікам». Ён затгаўляў для іх кажухі, валёнкі. Яму дапамагалі ў гэтым інжэнэры і тэхнікі—Гаўрушэнка, Гузэр, Калганаў (апошні тады быў загадчыкам Петраўпаўлаўскіх капальняў). У доме Калганава разьмясьціўся штаб карнага атраду эсаула Чэрняцова.

Як гэта ні дзіўна, але ўся гэта кампанія пасьля 1920 году, калі ў Данбасе ўмацаваліся чырвоныя, уцалела. Паціху Каладубы, Гаўрушэнкі, Гузэры і іншыя прытуліліся ў шахцінскіх капальнях. Калі рабочыя пазнавалі прыхвасьнаў Каладуба, яны выганялі іх з капальні. Самога Андрэя Каладуба рабочыя тры разы выганялі з капальні „Красненькой". Але ён не абражаўся і застаўся загадчыкам гаспадаркі ў суседняй капальні. Яго пазналі і там, і ён перайшоў у трэцюю капальню. Усё гэта ўдавалася таму, што за Каладубава ўступалась шахцінская інжэнэрна-тэхнічная сэкцыя.

Каладубаўскія малайцы, урэшце, занялі добрыя пасады. Калганаў пралез у галоўныя інжэнэры Данецка-Грушаўскага кіраўніцтва капальнямі, Гаўрушэнка—у загадчыкі капальні імя Вароўскага і г. д.

Спадзяючыся, што вернуцца старыя ўласьнікі, якія ў большасьці ўцяклі заграніцу, Каладубы ўзрывалі капальні, намаўлялі супроць савецкай улады рабочых, адмаўлялі нашы гаспадарчыя органы ад распрацоўкі новай капальні, у якой можна было здабыць шмат вугалю. Так, напрыклад, Каладубы скрылі вядомую праходку «Бэсэмэргенеўскую», якая знаходзіцца недалёка ад капальні «Кастрычнікавай рэвалюцыі». Праходка гэта калісьці належала акцыянэрнаму таварыству «Грушаўскі антрацыт». Яшчэ тады старая капальня была бэтаніравана, ачышчана ад ваданоснага пяску; старыя гаспадары не пашкадавалі аддаць на гэтую справу 400.000 рублёў, бо „Бэсэмэргенеўка" суліла вялікія багацьці.

А калі савецкая ўлада задумала пачаць правільную эксплёатацыю гэтай буйнай капальні, мясцовыя спэцыялісты, якія знаходзіліся на службе ў чужаземнага капіталу, закрычалі ў адзін голас, што „Бэсэмэргенеўка" нічога ня варта. Усімі спосабамі яны руйнавалі і расьцягвалі з капальні ўсё абсталяваньне. Калі там нічога не засталося з абсталяваньня, яны зьнялі з вучоту гэтую капальню, зрабілі яе „няіснуючай", выкінулі яе нават з афіцыйных дакумантаў.

Другую капальню, — „Нова-Азоўскую", дзе таксама быў знойдзен магутны і вельмі даступны пласт вугалю, каладубаўскія малайцы згвалтаваралі і затапілі. Дасканалае абсталяваньне парасьцягвалі. Дарэчы сказаць, да гэтай капальні меў пэўную датычнасьць ангельскі капітал.

Аднак, контр-рэвалюцыйныя змоўшчыкі вялі ў сябе суровы вучот расьцягнутага абсталяваньня. У сваіх паказаньнях на сьледзтве некаторыя з арыштаваных так проста і заявілі:

— Мы аглядаліся назад—на ранейшых уласьнікаў.

Гэтыя «аглядкі» сустракалі, аднак, адпаведны поўны ўзаемнасьці водгук «адтуль», з-за рубяжа. Прыяжджалі нейкія цёмныя асобы наведацца, алобрыць і ўдзіць бодзерасьці рушлівым прыказчыкам заслужоных шпёнаў. Цікава, што чым больш узмацнялася сувязь СССР з заграніцай, тым часьцей пачалі прыяжджаць у Шахцінскі раён чужаземныя «госьці». Яшчэ ў 1925 годзе прыяжджаўшыя ў Шахцінскі раён чужаземцы ўсяляк абадзёрвалі каладубаўска-гаўрушынкаўскую кампанію абяцанкамі, што праз тры гады інтэрвэнцыя ўжо будзе абавязкова і што да яе трэба рыхтавацца.

Гаўрушэнкі і Каладубы рыхтаваліся. Наколькі яны былі ўпэўнены ў прыходзе чужаземцаў—відаць з таго, што кожны з шахцінскіх контр-рэвалюцыянэраў загадзя выпрасіў сабе ў гасьцей лепшыя і больш цёплыя пасады. А тыя былі добрыя: нават навыдатным удзельнікам шпіянажу абяцалі добрае месца,—ня ніжэй загадчыка капальні.

Але лёс вырашыў інакш. Зразумела, зараз яшчэ ня могуць быць агалошаны ўсе даныя сьледзтва, бо яно яшчэ ня скончаны, але з тых даных, якія мы сёньня паведамляем, відаць, якая агідная і подлая справа рабілася ў Шахцінскім р. Паўночнага Каўказу.

Перад вясеньняй сяўбой.

Абавязковыя культурныя мерапрыёмствы ў сельскай гаспадарцы.

Савет Народных Камісараў СССР выдаў пастанову «Аб пляне дзяржаўных мерапрыёмстваў па сельскай гаспадарцы на 1927-28 год», у якой ёсьць вельмі важны пункт пра культурныя палепшаньні ў сельскай гаспадарцы.

Гэты пункт гаворыць:

«Дзеля больш мэтазгоднага скарыстаньня зямлі і правядзеньня неабходных агрыкультурных мерапрыёмстваў — распрацаваць і прадставіць да 1 верасьня 1928 г. у Дзяржплян СССР даклад па пытаньню аб вызначэньні тых агрыкультурных патрабаваньняў, якія дзяржава павінна прад'явіць да землякарыстальніка, і аб парадку ажыцьцяўленьня гэтых патрабаваньняў».

Такім чынам, дакрэтам ураду робіцца сур'ёзны крок да абавязковага ўжываньня ўсімі землякарыстальнікамі тых ці іншых культурных мерапрыёмстваў у іх гаспадарцы. У дакроце ясна гаворыцца аб патрабаваньнях у гэтым сэнсе з боку дзяржавы.

Само сабой зразумела, што гэтыя патрабаваньні павінны быць даступны і магчымы да выкананьня. Да розных катэгорый землякарыстальнікаў можна прад'явіць розныя патрабаваньні: да савхозаў і калхозаў—адны патрабаваньні, для паасобных землякарыстальнікаў—другія, да земляўпарадкаваных і перайшоўшых на шматпольле—адна мерка, да трохпалёўкі—другая, да слабых і больш моцных гаспадарак таксама павінен быць розны падыход.

Што тычыцца бядняцкіх гаспадарак, дык абавязковае правядзеньне імі тых ці іншых палепшаньняў павінна праводзіцца пры дапамозе дзяржавы і кааперацыі. Малая гаспадарка ў большасьці выпадкаў ня можа праводзіць нават простых агрыкультурных палепшаньняў.

Тут мае значэньне і недахват інвэнтару, і цяжкасьці з пасеньнем, і надзвычайная запушчанасьць зямлі, і недахват угнаеньня, і наогул розныя акалічнасьці заняпалай бядняцкай гаспадаркі.

Гэтыя акалічнасьці прымушаюць часта ня столькі думаць аб працы па культурнаму ўздыму сваёй слабай гаспадаркі, колькі аб тым, каб знайсьці заработак на старане. Вось чаму, кажучы аб абавязковым правядзеньні палепшаньня ў землякарыстаньні, дэкрэт у цэлым высоўвае адначасна дзяржаўнае падтрыманьне бядняцкай часткі гаспадарак, **ставячы на першы плян калектывізацыю іх.**

Значна лягчэй прад'явіць абавязковыя патрабаваньні аб правядзеньні тых ці іншых агрыкультурных палепшаньняў у небядняцкай гаспадарцы. Падштурхваньне з боку дзяржавы па гэтай лініі асабліва важна таму, што сярэдняя гаспадарка зьяўляецца галоўным ядром у вёсцы.

Досыць невялікага штуршка і дзелавой ініцыятывы з боку мясцовых органаў улады, каб дамагчыся правядзеньня тых ці іншых культурных палепшаньняў. У гэтым сэнсе ініцыятыва і ўмелае ўмяшаньне райвыканкомаў і сельсаветаў зьяўляецца часта вялікім падмацаваньнем для перадавой часткі вёскі і дае ёй магчымасьць надаць больш шырокі размах намечаным палепшаньням.

Возьмем гэткія пытаньні, як палепшаньне сенажаці, зьнішчэньне папару, узорваньне на зіму, змаганьне з дзікімі травамі, культурнае скарыстаньне грамадзкіх зямель, больш простыя мэліярацыйныя работы і г. д. Тут ня столькі трэба пераканаць, колькі арганізаваць вёску для правядзеньня прасьцейшых культурных мер, накіраваных да палепшаньня гаспадаркі. Якраз гэтага элемэнту—арганізацыі—амаль нідзе няма.

Пастанова саюзнага ўраду намячае распрацоўку пляну абавязковых мерапрыёмстваў толькі к 1 верасьня, але гэта ані не перашкаджае зараз-жа, ужо ў вясеньнюю сяўбу, зрабіць усё магчымае, бяручы прыклад з тых гаспадарак і райёнаў, якія да гэтага часу былі перадавымі ў гэтым напрамку.

Сярод задач вясеньняй сяўбы пытаньне аб правядзеньні ў абавязковым парадку тых ці іншых прасьцейшых масавых палепшаньняў у вёсцы павінна быць самым неадкладным.

Аб масавай агітацыі да пасяўной кампаніі.

АПА ЦК КП(б)Б прапанавала ўсім АПА ніжэйшых партарганізацый разгарнуць шырокую масавую агітацыю аб значэньні вясеньняй пасяўной кампаніі. На мясцох неабходна шырока папулярызаваць выгады значэньне калектыўных формаў сельскае гаспадаркі, шматпольля, земляўпарадкаваньня, а таксама растлумачыць мерапрыёмствы партыі ў справе дапамогі беднаце і інш.

Кожны райён у сваіх умовах павінен будзе шырока папулярызаваць свае пляны пасяўной кампаніі.

Для практычнага правядзеньня папулярызацыі пасяўной кампаніі будуць скарыстаны: партыйныя камсамольскія адчыненыя сходы, пашыраныя пленумы РВК і сельсаветы, сходы рабочых савецкіх гаспадарак, сходы сяброў калгасаў, камун, арцеляў, шырокія сялянскія сходы, спэцыяльныя райённыя сходы груп беднаты. Як відаць, усе арганізацыі разам з насельніцтвам павінны будуць увяць значэньне пасяўной кампаніі, ад папулярызацыі якой будуць залежаць усе посьпехі.

Нарадамі, хаты-чытальні, чырвоныя куткі праводзяць шырокую падрыхтоўку да вясеньняй пасяўной кампаніі, дзе тлумачаць сялянству значэньне яе. Будуць выпушчаны спэцыяльныя нумары пасьценных газэт, прысьвечаныя пасяўной кампаніі.

Апроч усяго гэтага даручана ўсім АПА акругкомаў і райкомаў, ва ўсёй вясковай сетцы партыйнай і камсамольскай асьветы правесьці гутаркі аб задачах вясеньняй пасяўн. кампаніі.

Павялічваем засеў лёну.

(Арцель «Восход», Гарадоцкага р.).

Для ўзмацненьня падрыхтоўкі да пасяўной кампаніі наша арцель выдзеліла свае машыны для ачысткі збожжа. Каапэрацыя ўжо завезла каля 500 пуд. аўсу і іншага насеньня, але востра адчуваецца недахват бульбы і насеньня ільну.

З прычыны недароду ў гэтым годзе, у сялян ільнянага насеньня амаль не засталося.

Усё-ж мяркуецца павялічыць пасяўную плошчу пад лён на 10 проц. і пад бульбу—на 7 проц.

Арцель «Красное Знамя» **павялічвае засеў лёну на 20 дзесяцін.**

Разьмеркаваньне кантрактацыі пасеваў у БССР.

Эканамічная Нарада ўстанавіла наступнае разьмеркаваньне кантрактацыі розных культур у надыходзячую пасяўную кампанію: канюшыны—2000 гэктараў, сэрадэлі—300 гэктараў, лубіну—1500 гэтараў, ячменю броварнага—800 гэктараў, лёну-даўгунцу—2000 гэктараў і значны пляц высадак кармавых буракоў.

Разьмеркаваньне пасяўной плошчы, якая падлягае кантрактацыі, праводзіцца паміж акругамі Белсельсаюзам па ўзгадненьню з НК Земляробства, а па паасобных раёнах—Акрземаддзеламі супольна з Акрсельсаюзамі.

Устаноўлены наступныя разьмеры авансаваньня кантрактацыі пасеваў на насеньне: на канюшыну ад 40 да 60 р. гэктар (беднякі атрымліваюць 60 руб. крэдыту на гэктар, серадняк 50 р., больш заможныя—40 р.), на сэрадэлю—ад 25 да 30 р., на лубін—ад 17 да 23 р., на ячмень броварны—ад 17 да 23 р. і на лён-даўгунец—ад 10 да 14 р.

Патрэбныя для правядзеньня кантрактацыі сродкі павінны быць выплачаны Дзяржбанкам—24 тысячы руб. для пасеву лёну, а на пасеў іншых культур выдаюцца сродкі Белсельбанкам: 100 тыс. руб. на канюшыну, 9 т. руб. на сэрадэлю, 30 тысяч на лубін, 5 тысяч руб. на кармавыя буракі і 16 тысяч руб. на броварны ячмень.

Для разрахункаў з пастачыкамі ўстанаўляюцца наступныя цэны: канюшына ня ніжэй 14 р. за пуд, сэрадэля 2 р., лубін 1 р., кармавыя буракі 10 р., броварны ячмень 1 р. 40 к., лен даўгунец 2 руб.

Правядзеньне ўсёй апэрацыі кантрактацыі ўсіх гэтых пасеваў ускладаецца на Белсельсаюз.

Менскі акруговы зямельны аддзел дапамог... прыватніку і кулакам.

Ільготы, якія дзяржава прадастаўляе нашым калектыўным гаспадаркам, час-ад-часу, з прычыны нядбайнасьці працаўнікоў савецкіх устаноў, дастаюцца і нашым клясавым ворагам.

Зьвернемся да фактаў.

«Таварыства» прыватніка Мазо.

Уласьнік прыватнага смалярнага заводу з вур. Пісанка, Драчкоўскага сельсавету, гр. Мазо эксплёатаваў сялян бліжэйшай вёскі. Сяляне капалі для Мазо карчы, працуючы па 12-15 гадзін у суткі і атрымліваючы за сваю цяжкую працу капейкі.

Надумаў гр. Мазо шырэй разгарнуць эксплёатацыю свайго заводу, а разам з тым і сялян, ды вось бяда—няма для звароту капітала, але...

Выхад з гэтага становішча быў хутка знойдзены. Арганізуе Мазо са сваіх рабочых «мэліярацыйнае таварыства». Зарэгістраваў яго ў Менскім Акрза і на падставе гэтага атрымаў з Белсельбанку крэдыт у суме 600 руб.

Вядомая рэч, ніякай мэліярацыйнай працы Мазо не праводзіў, а скарыстаў гэтыя грошы на загатоўку сыравіны для пашырэньня вытворчасьці свайго заводу.

«Мэліярацыйнае таварыства» імя Калініна.

Пяць сялян-кулакоў надумалі асушыць сваю сенажаць. Да слова сказаць, усе яны зьяўляюцца крэўнымі і прозьвішча чатырох з іх—усё Ксяневічы.

Сказана—зроблена. Яшчэ ў 1926 годзе гэтыя „калектывісты", якія маюць каля 140 дзесяцін зямлі, атрымалі з Чэрвенскага с.-гасп. крэдытнага таварыства крэдыт у суме 1500 руб.

Як і што яны рабілі,—аб гэтым нам невядома, але толькі ў 1927 г. нашыя «калектывісты» арганізуюць на паперы мэліярацыйнае таварыства. Зарэгістравалі яго такжа зноў у Менскім Акрза і па хадайнічаньню апошняга для «працягу работ» атрымалі з Белсельбанку яшчэ 552 руб.

Бачыце, як хутка і без цераніны ў нас можна атрымаць дзяржаўныя грошы.

На справе-ж, як то сьведчыць ведамасьць гэтага «таварыства», усе грошы разьмеркаваны паміж паасобнымі «членамі» апошняга.

А што скажа Менскі Акрза?

Але ўрэшце ўся справа высьветлілася, і Нарсуд 29 лютага г. г. пастанавіў сыскаць з «мэліяратараў» датэрмінова атрыманы імі ад дзяржавы крэдыт.

Добра, так і належыць, але нас цікавіць,—ці ня трэба было-б разам з гэтымі „мэліяратарамі" прыцягнуць да адказнасьці і тых, хто ім дапамог атрымаць дзяржаўныя грошы і яшчэ на досыць вялікі тэрмін для сваіх уласных патрэб.

Цікава, ці заўсёды ў Менскім акруговым зямельным аддзеле так проста і без цераніны вырашаюцца справы?

В. З-ў.

Што сказаў усебеларускі зьезд камітэтаў сялянскай узаемадапамогі аб вясеньняй сяўбе.

5-ты ўсебеларускі зьезд камітэтаў сялянскай узаемадапамогі прыняў дэлы шэраг дырэктыў у галіне ўзмацненьня і нармальнага правядзеньня вясеньняй пасяўной кампаніі.

Дзеля забясьпечаньня запатрабаваньняў бядняцкіх гаспадарак у рамоне сельска-гаспадарчага інвэнтару пастаноўлена арганізаваць цэлую сетку майстэрняў з такім разьлікам, каб на працягу 2-х бліжэйшых гадоў арганізаваць да 100 райённых майстэрняў, прычым сёлета павінна быць арганізавана да 50 такіх майстэрняў.

Каб забясьпечыць бяднейшую частку нашай вёскі неабходным сельска-гаспадарчым інвэнтаром будзе ўзмоцнена сетка існуючых пракатных і насенна-ачысных пунктаў. Апроч таго, гэтыя пункты маюць быць папоўнены патрэбнымі машынамі і прыладамі. У гэтую кампанію трэба ўжыць рашучыя крокі, каб поўнасьцю нагрузіць насенна-ачысныя пункты; у першую чаргу трэба даваць карыстацца бядняцкім і чырвонаармейскім гаспадаркам.

Зараз-жа пастаноўлена ўжыць рашучыя захады да ўзмацненьня загатоўкі насеннага матар'ялу па ўсёй сыстэме камітэтаў узаемадапамогі. Дзеля гэтай мэты трэба поўнасьцю выкарыстаць усю гатоўку гранаовых сродкаў, якія знаходзяцца ў карыстаньні камітэтаў. Прымаючы пад увагу ня вусім здавальняючую якасьць пасеўнага матар'ялу ўраджаю 1927 г., трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на ачыстку насеньня. У райёнах, дзе пашырана сажа, насеньне трэба абавязкова пратручваць; дзеля атрыманьня фармаліну ці купарвасу, трэба зварачвацца да райённых агранома[illegible].

Вялікая ўвага зварачваецца на дапамогу бядняцкім і чырвонаармейскім гаспадаркам, у якіх адчуваецца брак рабочае і конскае сілы. У пэрыяд вясеньніх сельска-гаспадарчых работ і пры вборы ўраджаю павінна быць арганізавана працоўная дапамога ў выглядзе талакі.

Улічваючы неабходнасьць пашырэньня мерапрыёмстваў па кантрактацыі засеваў, асабліва тэхнічных культур, камітэты узаемадапамогі павінны правесьці адпаведную працу па ўцягненьні сяброў таварыства па кантрактацыі пасеваў, асабліва бядняцкіх гаспадарак.

НАЦМЕНШАСЬЦІ ПОЛЬШЧЫ НА ПАРЛЯМАНЦКІХ ВЫБАРАХ.

Як прызнае сама польская буржуазія, у межах сучаснае польскае дзяржавы да пануючае нацыянальнасьці належыць толькі дзьве траціны ўсяе насельнасьці, а адна траціна прыходзіцца на так званыя „нацменшасьці" (mniejszości narodowe). Па падліччэньнях, якія выходзяць ад розных дзелачой самых нацменшасьцяў, процант няпольскае насельнасьці ў сучаснай Польшчы дасягае 40 проц.

У адносінах да ўсіх нацменшасьцяў польская буржуазея імкнецца праводзіць аднакавую палітыку ўціску і дэнацыяналізацыі ня толькі ў адносінах да тых нацменшасьцяў, якія расьсеяны на ўсёй дзяржаве (яўрэі, часткова немцы), але таксама і да тэрытарыяльных нацменшасьцяў (украінцы, беларусы, часткова немцы), якія на украінных абшарах складаюць большасьць насельнасьці.

Дэнацыяналізатарская палітыка польскае буржуазеі сустракае адпор з боку нацменшасьцяў, але адпор гэты неадвавы і залежыць ад матар'яльнага і культурнага разьвіцьця адпаведнае нацыянальнасьці. Найменей культурваю і заможнаю зьяўляецца беларуская нацменшасьць, і дэнацыяналізатарскі націск польскае буржуазеі ў Заходняй адбіваецца якраз на беларусах. Няпольскія нацыянальнасьці Польшчы розьняцца паміж сабою ня толькі сярэднім матар'яльным узроўнем і розную вышынёю культурнасьці, але таксама і мераю сацыяльнае дыфэрэнцыяцыі і тою роляю, якую ў нацыянальна-культурным і палітычным жыцьці адпаведнае нацыянальнасьці адыгрывае не буржуазея. У гэтым сэнсе за процілеглых канцох знаходзяцца і геаграфічна процілеглыя нацменшасьці—беларусы і немцы.

Пагроза самаму існаваньню няпольскіх нацыянальнасьцяў Польшчы з боку валяўнічага польскага нацыяналізму прымусіла іх у 1922 г. аб'яднацца разам дзеля супольнае абароны. На час соймавых і сэнацкіх выбараў 1922 года быў створаны так званы „Блёк нацменшасьцяў", які правёў 81 дэпутата ў сойм і 25 у сэнат. Гэтая лічба, як лёгка пераканацца простым вылічэньнем, не адпавядае сапраўднаму процантнаму ўдзелу нацменшасьцяў Польшчы ў агульнай масе насельнасьці. Пры захаваньні нармальных процантных суадносін нацменшасьці павінны былі-б мець 150-170 дэпутатаў у сойме і 35-45—у сэнаце. Малая нацыянальная самасьвядомасьць і неарганізаванасьць беларусаў з аднаго боку і няўдзел у выбарах украінцаў Усходняе Галіцыі з другога боку—былі галоўнымі фактарамі, якія не далі магчымасьці няпольскім нацыянальнасьцям дасягнуць большага прадстаўніцтва ў парляманце.

Але тая лічба мандатаў, якую нацменшасьці атрымалі на выбарах 1922 году, зьявілася нечаканаю для польскае буржуазеі і вельмі ўстрывожылі яе. Соймавыя і сэнацкія выбары 1922 г. былі першымі парляманцкімі выбарамі, у якіх Заходняя Беларусь прымала ўдзел, і зьявіліся экзаменам яе палітычнае дасьпеласьці. Як для першага разу, вынік быў вельмі добры, неспадзяваны ні для ўрадавых польскіх сфэраў, ні нават для самых арганізатараў-беларусаў. 11 мандатаў у сойм і 3 у сэнат паказалі, што беларускія народныя масы Заходняй Беларусі вядомы да масавае арганізаванае дзейнасьці ў абставінах буржуазнага парляментарызму, і што з беларусамі трэба лічыцца. У далейшым у сойме было толькі 9 беларусаў, бо адзін дэпутат быў засаджаны ў турму (С. Баран), а другі (С. Якавюк) уцёк заграніцу, ратуючыся ад арышту.

Хоць соймавая дзейнасьць беларускіх дэпутатаў не заўсёды была ўдалаю (узяць хаця-бы падтрыманьне ўраду ген. Сікорскага), тым ня менш яна мела вялікае значэньне ў некалькіх адносінах. Папершае, яна зьвярнула ўвагу Заходняе Эўропы на налічнасьць на Ўсходзе Польшчы значных беларускіх масаў у становішчы бяспраўя і прыніжэньня; падругое, яна прывучыла польскую буржуазею лічыцца з беларусамі; патрэцяе (і самае важнае)—яна прывучыла беларускую насельнасьць да выкарыстоўваньня легальных спосабаў адстойваньня сваіх праў. Соймавыя выступленьні беларускіх дэпутатаў і іх інтэрпэляцыі далі шмат матар'ялу да ўразуменьня сучаснага становішча Заходняе Беларусі. Іх-жа паездкі ў розныя мясцовасьці і выступленьні падчас у самых глухіх кутках краю значна прычыніліся да ўзьняцьця нацыянальнае і клясавае сьвядомасьці беларускіх народных масаў.

«Блёк нацменшасьцяў» 1922 г. быў творам штучным, які быў выкліканы асаблівасьцямі польскага выбарнага закону, недагоднага для дробных групаў. Пасьля выбараў спачатку ўтварыліся чатыры асобныя нацыянальныя клюбы, а далей пайшоў раскол у паасобных клюбах. Клясавы момант стаў выбірацца наверх з-пад часова прыкрытага яго лёзунгу агульна-нацыянальнага і міжнац. аб'яднаньня.

Чым бліжэй падыходзілі новыя соймавыя і сэнацкія выбары, тым ясьней станавілася, што блёк тыпу 1922 г. болей немагчымы. Далёка зайшоўшае партыйнае разьмежаваньне ў беларусаў і украінцаў і абвастрэньне сацыяльнае барацьбы ў Заходняй Беларусі і Украіне рабілі гэткі блёк немагчымым. Таксама і сярод яўрэяў ідэя новага блёку па тыпу 1922 г. не спаткала агульнае прыхільнасьці.

Са значнымі цяжкасьцямі быў створаны блёк звужанага тыпу—адных толькі буржуазных арганізацый: украінскіх, нямецкіх, яўрэйскіх і беларускіх. У Заходняй Беларусі да блёку далучыліся хадэкі і сельсаюзьнікі Яроміча і Рагулі, у Заходняй Украіне— «Ундо». Беларускія і украінскія [illegible] шлі на выбары [illegible] ся на некалькі [illegible] групаў: правіца і [illegible] ў Заходняй Белару[illegible] «Сельроб» у Заход[illegible] нымчынам у Палес[illegible] шчыне), украін[illegible] (галоўным чынам [illegible]

Польская буржу[illegible] выказалі рэзкую [illegible] аднаўленьня блёку [illegible] 1922 г., а да бле[illegible] несьліся больш [illegible] ў Заходняй Белар[illegible] асаблівага посьпех[illegible]

Затое ўжо [illegible] ўрад скіраваў на [illegible] бурэньне левых [illegible] скіх арганізацыяў [illegible] за цэльны год п[illegible] джэньне ў турму [illegible] працаўнікоў меў [illegible] ўсё выбарныя мер[illegible] тыву Грамады [illegible] кіраваць імі. Пр[illegible] ку незадоўг[illegible] да [illegible] на Валыні, [illegible] шаю часткаю [illegible] самымі выбара[illegible] ўвазе стараны[illegible] інскіх выбарчых [illegible]

Не зважаючы, аднак, на ўсё гэта, агульная лічба дэпутатаў ад нацменшасьцяў павялічылася,—праўда, нязначна, але ўсё-ж павялічылася. Важна тое, што яна не паменшылася. Надзеі польскае буржуазеі і «санацыйных» адміністратараў, што такія меры значна зьменшаць прадстаўніцтва ад нацменшасьцяў, не апраўдаліся. Гэта зьяўляецца вялікаю перамогаю нацмен. Агулам у Сойм прайшло 88-89 дэпутатаў нацмен, ня лічачы прайшоўшых па ўрадаваму блёку, у якім значацца —паміж іншымі—двое «беларусаў», двое яўрэяў і г. д.

Пры першых вестках аб выніках выбараў урадавы друк трымфаваў ня толькі таму, што ўрадавы блёк здабыў [illegible] мандатаў, але так[illegible] зусім здаволены.

Нядрэнна стаяць выбарныя справы украінцаў. Левыя сьпіскі здабылі 20 мандатаў у Сойм, правае «Ундо» (Украінскае Нацыянальна-Дэмакратычнае Аб'яднаньне)—26 соймавых мандатаў. У першых вестках колькасьць украінцаў была пададзена менш сапраўднасьці, і прайшло некалькі дзён, пакуль польскія буржуазныя газэты абвясьцілі няпрыемную дзеля іх праўду. 46 украінцаў у Сойме зьяўляюцца прыкрым сюрпрызам дзеля польскае буржуазеі. У Сэнаце проціў ранейшых 6 сэнатараў украінцы цяпер маюць 10. Зразумела, што гэта менш, чым украінцам належыцца адпаведна іх процанту, але ўсё-ж гэта зусім здавальняючы вынік у абставінах тэрору, прапасу 135 масавых арыштаў, забароны [illegible]

У гэтым-жа годзе беларускія сьпіскі там ня былі дапушчаны. Вельмі шкода, што ня было беларускіх сьпіскаў у Пінску і Ёрасьці, дзе нават па польскай статыстыцы 1921 г. большасьць беларуская. У 1922 г. пры разьмеркаваньні кандыдатур па блёку нацмен беларускія дзесячы чамусьці ўступілі першыя мейсцы украінцам, а ў гэтым годзе беларускія сьпіскі там здаецца, і не заяўляліся, бо аб забароне ня чуваць было. Адзін альбо нават пара мандатаў прапалі не па віне польскага ўраду, а па сваёй уласнай.

Калі-б выбары ў Заходняй Беларусі адбываліся ў абставінах, хоць сколькі небудзь блізкіх да нармальных, можна было-б чакаць падваеньня лічбы беларускіх дэпутатаў і сэнатараў. Але разгром «Грамады», шматразовыя ма[illegible] і пась[illegible]

Жыцьцё і праца асьветніка.

Праца пашыраных пэдсаветаў і апорных школ.

Для падняцьця кваліфікацыі вясковага настаўніцтва і павышэньня выкарчасьці школы па райёну, з пачатку гэтага навучальн. году ўтворана сетка апорных школ, а каля іх згуртованы пашыраныя пэдсаветы з акаляючага настаўніцтва. Хоць тэрмін існаваньня пашыраных пэдсаветаў яшчэ невялікі, але ён дае ўжо пейкі вопыт, якім трэба падзяліцца.

На нарадзе старшынь пашыраных пэдсаветаў Сьмілавіцкага райёну, якая адбылася 11 сакавіка ў Сьмілавічах, выявілася наступнае.

Большасьць пэдсаветаў працуе, удзел прымае 80 проц. настаўніцтва; пратакольных пасяджэньняў адбылося за гэты год 5-6. Разглядаліся арганізацыйныя і праграмна-мэтадычныя пытаньні. Распрацоўка якога-б то ні было пытаньня загадзя даручалася аднаму-двум таварышом, якія, добра падрыхтаваўшыся, рабілі даклад на нарадзе пашыранага пэдсавету, дзе гэта пытаньне ўсебакова абгаварвалася і выносілася матывіраваная пастанова, якая ўводзілася ў школьную працу.

Асаблівай увагі заслугоўваюць практычныя лекцыі, у крытычным разборы якіх прымае ўдзел усё настаўніцтва, дзе яскрава падмячаюцца ўсе недахопы, якіх сам выкладчык зачастую не заўважае.

Праца апорнай школы, як прыклад для ўсіх акаляючых, наступная:

Выкладаньне вядзецца ва ўсіх групах па комплексным сыстэме. Распрацоўка матар'ялу робіцца на тыдзень, падрахунак, або вучот—за дзень. Мэтад—пераважна слоўны. Сярэдняя паспяховасьць вучняў 80 проц., веды па навыках здавальняючыя.

Ёсьць вучнёўскае самакіраваньне. Дзеці выпісваюць газэты і журналы.

Адносіны насельніцтва да школы добрыя, што відаць з дапамогі яго школе прывозам дроў за вёрст 30-40.

З пытаньняў і спрачак выявілася, што ў даваньні практычн. лекцый назіраецца выпадковасьць, няма сталай папярэдняй падрыхтоўкі і мэтавай устаноўкі. Таксама веды па навыках можна лічыць здавальняючымі, калі параўнаць 4 групу вясковай школы з тэй самай групай сямігодкі, і што вучні-выпускнікі вясковых школ ня могуць пасьпяваць у У клясе сямігодкі. Краязнаўчага матар'ялу ў комплексах ня толькі вясковых школ, але і сямігодак вельмі мала, і праца гэта вядзецца ня так, як належыць. Хоць дакладчыкі і казалі, што вучні добра ведаюць свой край і мясцовае жыцьцё, але гэта нямое веданьне, не пашыраецца шуканьнем, ня робіцца прычынай сувязі ў зьявах мясцовага жыцьця і підзе гэта жыцьцё ў школе не адбіваецца. Гэты бок працы вельмі кульгае.

Нарада ўхваліла ажыцьцявіць наступнае:

Зьнішчыць выпадковасьць у даваньні практычных лекцый і наладзіць сталую папярэднюю іх падрыхтоўку; практычныя лекцыі нарада лічыць вельмі карыснымі; абавязкова плянаваць і падлічваць школьную працу для назапашваньня вопыту; пашыраным пэдсаветам дапамагчы аднакамплектавым школам канчаткова перайсьці на комплексную сыстэму выкладаньня; узмацніць працу вучнёўскага самакіраваньня і ў набыцьці сацыяльных звычак; сямігодкам паглыбіць працу і вопыт свой распаўсюджваць па 4 камплект. і др. школы, для чаго ўліцца ў пашыраныя пэдсаветы свайго сельсавету.

У грамадзка-карыснай працы ставіць мэту і дамагацца рэальных вынікаў яе. Давесьці заняткі да канца навучальнага году з поўным вучнёўскім складам, растлумачыць бацькам палажэньне аб увядзеньні ўсеагульнага навучаньня. Кожнай школе мець сталы вучот дзяцей школьнага ўзросту бедноты і батрацтва для акопу іх школаю ў будучым навучальн. годзе на ўсе 100 процантаў.

Краязнаўчую працу разьвіваць праз увязку ў плянах мясцовага матар'ялу, які па апрацоўцы лічыць, як навуковую вартасьць для данай мясцовасьці.

Сьмілавічы. **Шыдлоўскі.**

Разумова адсталыя вучні ў школе.

Балючым зьявішчам у жыцьці і працы савецкае школы зяўляюцца гэтак званыя разумова адсталыя дзеці. Гэты элемэнт, нават будучы нязначным па колькасьці ў нашых школах наогул, усё-ж такі, пакуль ён ёсьць, перашкаджае нармальнай, працы і аб ім патрэбна гаварыць, патрэбна шукаць сродкі і мажлівасьці, каб ад яго школа або зусім пазбавілася, або процант усіх адсталых быў зьведзены да мінімума.

Праўда, да сучаснага моманту гэтаю справаю займаліся малавата, мяркуючы на тое, што справа гэтая ня новая, што гэтая справа мае месца ня толькі ў сучаснай савецкай школе, але яна з посьпехам існавала і ў школе дарэвалюцыйных часоў.

Ужо тады некаторыя выдатныя пэдагогі і школьныя ўрачы прабавалі зварачваць грамадзкую думку на гэтае хворае зьявішча, таму што школа знала адзіны сродак барацьбы з гэтым зьявішчам—гэта звальненьне са школы за непасьпяховасьць. У перадрэвалюцыйныя гады, 1910-13 г., па вялікіх гарадох, як Масква, Петраград і інш., гарадзкія самакіраваньні і дзясячы па нарасьвеце выносілі пастановы аб неабходнасьці арганізацыі дапаможных груп дзеля адсталых, непасьпяваючых вучняў, а таксама неабходнасьці вывучэньня прычын аб'ектыўнага і суб'ектыўнага характару, на глебе якіх вырасла непасьпяховасьць.

Прыходзіцца згадзіцца, што ў гэтым напрамку зроблена раней, як і цяпер, мала, ня гледзячы на тое, што лік непасьпяховасьці сярод вучняў іншы раз і тады быў каласальны — да 25 проц. (справаздача на зьезьдзе дзячоў нарасьветы ў 1910-11 навуч. годзе). Зразумела, што савецкая школа паку́ль што яшчэ хварэе гэтай хваробай. Органы сацвыху Наркамасьветы, а таксама і акруговая інспэктура шчыра бяруцца за вывучэньне гэтае справы, але да гэтага часу посьпех у працы невялікі. Праўда, па гор. Менску за апошнія два гады заснаваны дзьве групы дзеля разумова адсталых вучняў (здаецца абедзьве першыя), напісана некалькі абежнікаў агульнага зьместу па гэтаму пытаньню і, калі не памыляюся, усё. Мне, здаецца, што справу вырашыць ня так проста і вылячыць хваробу адчыненьнем новых груп, або абежнікамі нельга. Тут патрэбна ўважная праца як у школе, так і па-за школаю, каб дасканала вывучыць прычыны, на глебе якіх вырасла непасьпяховасьць таго ці іншага вучня, якая мае месца ня толькі ў малодшых клясах, але назіраецца і ў старэйшых. Пры гэтым неабходна памятаць, што прычыны непасьпяховасьці ў значнай частцы носяць сацыяльны характар. Тут не апошнюю ролю займаюць кватэрныя ўмовы жыцьця, харчаваньне, хваравітасьць бацькоў, агульнае становішча здароўя вучня і паасобныя дэфэкты: органаў мовы, нэрвовасьць, блізарукасьць, слабае разумовае і фізычнае разьвіцьцё і г. д.

Кіруючым нарасьветаю органам неабходна наклапаціцца аб арганізацыі дзеля бяднейшай часткі вучнёўства гарачых сьнеданьняў, наогул матар'яльнай дапамогі вучням бедных бацькоў, а таксама на лета арганізаваць дзеля такіх адсталых дзяцей калёнію дзе-небудзь за горадам. На бліжэйшы час па школах, хаця-бы некаторых, арганізаваць дапаможныя групы ня толькі першага, але і другога канцэнтру, а на далейшы час праводзіць дасьледаваньне ў гэтым напрамку. **І. Масюкевіч**

Аб матэматыцы ў школе.

Выкладаньне матэматыкі ў школе мае вялікае значэньне, як практычнае, так і тэарэтычнае. Практычнае значэньне матэматыкі добра ведае кожны рабочы і селянін, але мала хто зьвяртае ўвагу на вялікае выхаваўчае значэньне матэматыкі, апрача настаўнікаў. Ды і ня ўсе настаўнікі зьвяртаюць належную ўвагу на дысцыплінуючае і сыстаматызуючае значэньне матэматычных вылічэньняў. Часта мала зьвяртаецца ўвага на самую сыстэму і мэтады выкладаньня, на лёгічнасьць матэматычных разважаньняў і правільнасьць запісаў. У гэтым напрамку справа абстаіць надзвычайна дрэнна. Лічыцца, што важна атрымаць вынік, а якім чынам ён здабыў гэта—ня так [illegible] Такая пастаноўка пытаньня, [illegible] для найбольш пашыраная мэтодыка Ланкова) чамусь мала альбо зусім не зьвяртаюць увагі на прыёмы і тэхніку вылічэньняў, разьвязваньня задач, на што ранейшымі мэтадыстымі зварочвалася належная і патрэбная ўвага.

Гэты недахоп неабходна і трэба вы правіць хаця б спэцыяльным мэтадычным ліс.ом.

Вельмі патрэбны для вучняў масавае школы падручнікі (задачнікі), без чаго нельга паставіць матэматыку ў школе на належную вышыню. Нельга ж настаўніку ўвесь час самому складаць задачы. Ды і ня ўсім гэта пад сілу. А вучні просяць даваць ім задачы для разьвязваньня і ахвотна самі працуюць над пасільнымі і цікавымі задачамі. Запатрабаваньні вучняў, бацькоў і настаўніцтва ў адносінах да [illegible] належнымі задачнікамі [illegible] Тэ[illegible]кі неабходна [illegible] і са-[illegible]сьпечаньня [illegible]

Што перашкаджае культурнаму будаўніцтву.

(с. Юравічы, Полацкага райёну, Полаччына).

Кожнаму вядома, што толькі сяброўская, дружная спайка ў калектыве працаўнікоў дапамагае добраму вырашэньню пастаўленае мэты.

На вялікі жаль, яна часто ў калектывах нашых працаўнікоў адсутнічае, а адсюль вядома—склокі і паслабленьне працы.

Я хачу даць прыклад з калектыву настаўнікаў Юравіцкай сямігодкі. Там усё было-б добра, каб не забраўся туды адзін эгаланхалічны, эгаістычны настаўнік. І вось, ня гледзячы на тое, што ён толькі настаўнік, часам выкідвае такія справы, што адштурхвае людзей ад калектывізму, абкідвае іх грязьзю, а адсюль і паслабленьне працы.

Адным словам, ён робіць так, як яго «левая нага захоча». Спадабалася яму маладая настаўніца з сямігодкі. Ну, што-ж, калега! Спачатку хадзіў, гаварыў, ведаеце: „Я вам друг і таварыш" і г. д., потым стаў прыставаць з каханьнем і калі ня ўчуў узаемнага адказу, адразу пачаў сынаць гразь, пачаў прыдзірацца па працы (бо ён-жа сэкратар пэдсавету), гаварыць, што ваша праца ні к чорту ня варта і г. д., чым, бязумоўна, падарваў аўтарытэт яе як сярод настаўнікаў і вучняў, так і сярод насельніцтва.

Не спадабалася яму, што другая настаўніца выступае супроць такіх яго дзеньняў і ён нападае на яе.

Як толькі загадчык адлучыўся, а застаўся намесьнікам ён, зараз-жа звальняе яе з дадатковае пасады дзелавода, якую яна сумленна выконвала. Ды і як звальняе! Ня маючы на гэта ніякага права Намесьнікам стаў 4 студзеня, а звольніў 3 студзеня.

І, апрача таго, пусьціў сярод мясцовага актыву і часткі насельніцтва такія нават чуткі, што яна чуць ня контр-рэвалюцыянэрка. А сам ня ведае таго, што яна ў працягу 10 год была найлепшай вясковай актывісткай, некалькі разоў абіралася членам сельсавету, райвыканкому, прымала актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці. А сам «намесьнік» не працуе нават яшчэ і двух год.

Вось такія асобныя тыпы ў калектыве падрываюць яго спайку, а ад гэтага кульгае праца.

А райённае інспэктарскае вока, замест таго, каб наладзіць справу, прыветліва ўсьміхаецца дэзарганізатару.

Час скончыць з такімі адносінамі. У нас цяпер культурная рэвалюцыя, якую мы павінны правесьці ў першую чаргу сярод сябе.

Адам Палын.

„ВЫТВОРЧАЕ" ПЫТАНЬНЕ НА АМСЬЦІСЛАЎСКАЙ РАЙЁННАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ.

Аб неабходнасьці вытворчых пытаньняў на прафсаюзных канфэрэнцыях выказаўся ЦК нашага саюзу. За неабходнасьць гэтых пытаньняў адгукнуўся цэлы шэраг таварышоў на „Старонцы асьветніка". Але зусім інакшае ўражаньне зрабіла гэта пытаньне на Амсьціслаўскай канфэрэнцыі. Даклад аб становішчы вытворчай працы ў райёне рабіў райённы інспэктар асьветы. Пачаў ён з таго, што ён аб'ехаў 30 школ, бачыў тое, быў там, усё «прекрасно», усё надвычайна добра „комплексны мэтад" расьце і шырыцца, мае свае вынікі (а якія, ні слова) і г. д. Бязумоўна, у дакладзе ня было ніякага аналізу працы як школ, так і паліт-асьветных устаноў і даклад не здаволіў канфэрэнцыю.

Пачаліся пытаньні і тут больш яскрава высьветлілася, што інспэктар працы месц ня вывучыў, а „аб'ехаў" і нават толкам не апісаў. Інспэктару невядома самакіраўніцтва школ, інспэктару невядома, як навучаюць пісьму ў школах, інспэктару невядома грамадзянская праца школ, інспэктар да гэтага часу сам ня ведае, што такое комплекс і што за зьявярына мэтад, інспэктар да 1 студзеня ня ведаў колькі існуе лікпунктаў, да 10 сакавіка ён іх падлічыў, але яны адчыняліся стыхійна, баз усякага кіраўніцтва і да гэтага часу ў інспэктара няма пляну аплаты за лікпункты, няма пляну выпуску, няма ніякага мэтадычнага кіраўніцтва. Заместа ніякавага адчыненьня лікпунктаў і правільнага разьмеркаваньня сродкаў на гэту справу (асигнавана 1927 руб.), ён выпусьціў некалькі адозваў да настаўніцтва. Поўная адсутнасьць кіраўніцтва з боку інспэктара на літасьветнай працы: у працягу зімы ня скліканы ніводная нарада палітасьветнікаў, гаг-хат-чыт. не атрымліваюць ні жывога, ні пісьмовага кіраўніцтва; аб масавай працы хат-чыт. інспэктар ня мае ніякага ўяўленьня. А на запытаньне як працуюць масавыя арганізацыі пры хатах чытальнях і як яны забясьпечаны патрэбнай літаратурай інспэктар катэгарычна заявіў, што гэта не яго справа. Бязумоўна, аб тым, які, напр., хаты-чыт. прымаюць удзел у рэалізацыі сялянскай пазыкі і гаварыць ня прыходзіцца.

На запытаньне, як разгортваецца школьнае будаўніцтва ў райёне, інспэктар адказаў, што ён „больш месяца складаў сетку, аддаў на яе ўвесь час, але яна аказалася нявыгоднай і зараз яе трэба ўноў перараскладаць". А як практычна ідзе справа будаўніцтва, як у гэту справу ўцягнута насельніцтва, інспэктару зусім невядома. Невядома як будуць скарыстоўвацца вялікія вучасткі.

Праграмамі школы забасьпечаны ня ўсе і несвячасова. Інспэктару невядома як і дзе арганізовываліся школы сялянскай моладзі і як яны зачыніліся.

Калі некаторыя настаўнікі ў спрэчках пыталіся сказаць, што інспэктарам нічога ня зроблена і што з боку інспэктара няма ніякага кіраўніцтва, то інспэктар, абураны, у заключным слове гатоў-бы сьцерці з твару зямлі такіх настаўнікаў: „Ведаю я яго «фізыяномію», я ведаю чые гэта насьледзьдзе" і г. д. А калі абраная камісія пачала пісаць праўдзівую рэзалюцыю, то і тут інспэктар абурыўся і гатоў быў кулакі ўжыць. Але ў выніках камісія зазначыла (хоць дужа мякка) усе подахопы. Праўда, толькі па тых пытаньнях, якія інспэктар прызнаў сваімі. Аб дасягненьнях камісія нічога не сказала, з каб не пакрыўдзіць „начальства" дадала пункт: „Працу прызнаць здавальняючай". Праўда, па гэтаму пункту камісія раскалолася на дзьве часткі: адна, якая не баялася „начальства" і ўносіла пастанову не даваць „адзінкі" працы, таму што нічога няма, а другая з-за нашаны гэты пункт унесла. Для канфэрэнцыі гэта было ўсёроўна, вясковае настаўніцтва свае балючыя пытаньні ня вырашыла: з чым прышла на даклад, з тым і вышла, толькі час дарэмна страціла. Праўда, адзін досыць сьмелы настаўнік (якога інспэктар таксама выляў) заклікаў настаўніцтва не зварачаць увагі ні на даклад, ні на [illegible] а самім абмяркоўваць свае балючыя пытаньні самастойна, але з гэтага нічога не получылася. Так „вытворчае" пытаньне і скончылася. Які можна зрабіць вывад: на кіруючую культурную працу патрэбны насьпелы людзей, якіх-б ніхавіліся гэтай працай, былі-б хоць больш-менш падрыхтаваны да яе, а не балталіся, ня дурылі-б людзям галаву і не атрымоўвалі-б дарма грошы. Патрэбна катэгарычна адмовіцца ад „нашаны" і страхаў у абгаварэньні нашых недахопаў. Бязумоўна, часьцей і часьцей патрэбна ставіць вытворчыя пытаньні на нашых канфэрэнцыях і не на агульныя тэмы, а па асобных галінах працы. Вязоўчы тэарэтычную ўстаноўку з практычнай пастаноўкай нашых культасьветных устаноў.

Вока.

НЕПАРАДКІ У БУДАЎНІЦТВЕ ТРЭБА ХУТЧЭЙ ЗЬНІШЧЫЦЬ.

„Лесбел" вядзе будаўніцтва бяз пляну і каштарысу.—Матар'ялы для будаўніцтва не падрыхтаваны.—Дырэктыва аб зьніжэньні індэксу на 15 проц. наўрад ці будзе выканана.

ГАЛАВАЦЯПСТВА, А НЕ БУДАЎНІЦТВА.

„Быстрота и натиск".

Упяршыню думка аб пабудове Бабруйскага камбінату нарадзілася яшчэ ў 1925 г.

Ніякіх даных аб ступені мэханізацыі намечаных да пабудовы заводаў, ніякіх даных аб патрэбнай сілавой энэргіі і аб кошце ўсяго будаўніцтва «Лесбел» у той час ня меў.

Заклікае да сябе ў габінэт старшыня праўленьня «Лесбела» галоўнага інжынэра.

— Калі ласка, праэкцік, арыентыровачны, вядома...

— Які?

— Да камбінату ў Бабруйску...

— Ды што там доўга гаварыць? Да вайны гэта каштавала-б 200000 руб., ну, ды мэханізацыя яшчэ 100000,—значыцца, тысяч трыста.

— А цяпер... цяпер, скажам, тысяч 600000, ну, а для дакладнасьці возьмем 1200000 р.

— Лоўка ў вас выходзіць!—Галоўнае, «быстрота и натиск» відаць,—адказаў старшыня праўленьня інжынэру.

Сказана—зроблена. Так і ў плян унесьлі.

Камбінат трэба будаваць хутчэй.

Увосень 1925 г. у Беларусь прыехала камісія Савету Працы і Абароны. Паміж іншым, камісія, азнаёміўшыся з меркаваньнямі «Лесбела» аб пабудове ў Бабруйску камбінату, прызнала гэта вельмі мэтазгодным і дала заключэньне, што завод трэба будаваць хутчэй.

— Хутчэй? Што-ж, гэта мы можам, вось толькі азнаёмімся з пастаноўкай дрэваапрацоўчай прамысловасьці заграніцай.

У канцы лютага паехалі 2 прадстаўнікі «Лесбела» заграніцу. Азнаёміліся. Прыехалі.

— Эх, заграніцай! Тэхніка далёка пайшла наперад!..

— Далёка, кажаце? Ну, дык складзем праэкт па-загранічнаму. А па-загранічнаму—дык, калі ласка, 3600000 руб. (згодна папярэдніх падлікаў)!

Праэкты праэктамі падганяюцца...

Першы праэкт лесапільнага цэху прадугледжваў пабудову драўлянага будынку.

Прамыслова-эканамічная ўправа ў верасьні 1926 г. выказалася за каменны будынак.

Зроблены другі праэкт. Зараз сьцены аказаліся вельмі тонкімі.

Зрабілі трэці праэкт і, урэшце, 31-га мая ўжо 1927 г. ён быў разгледжан будаўнічым камітэтам ВСНГ СССР.

З праэктам фанэрнага цэху было яшчэ горш: першы складзен у лістападзе 1927 году і зноў быў не зацьверджан. Запрасілі з Нямеччыны інжэнэра. Пасьля шэрагу фармальных цяжкасьцяў ён прыехаў. Праэкт складзен і 14 кастрычніка зацьверджан у ВСНГ БССР. Пры гэтым было зроблена ўказаньне зараз жа прыступіць да пабудовы заводу.

Як бачыце, праэкты ўсё складаліся, перараскладаліся, а будаўніцтва распачалася ў маі 1927 г., а закладка нават яшчэ раней.

Пабудова заводаў скончыцца сёлета, а калі-ж будзем будаваць сілавую станцыю?

Водлуг інфармацыі адказнага працаўніка «Лесбелу», лесапільны цэх будзе скончан да 1 кастрычніка гэтага году, а іншыя цэхі—да 1 лютага 1929 году.

Значыцца, будуць устаноўлены ўжо ўсе машыны ды іншыя прылады. Адным словам, астаноўка толькі за энэргіяй, і заводы камбінату пойдуць поўным ходам, але...

Вось бяз гэтага «але» ніяк у жыцьці не абыдзешся...

Праэкт сілавой станцыі быў складзен у красавіку 1927 г. і ў маі прадстаўлен у Маскву.

Галоўэлектра прызнала неабходным уводзіць станцыю камбінату са станцыяй г. Бабруйску. За перараскладаньне праэкту ўзялося т-ва „Тепло и Сила" і скончыла яго ў верасьні 1927 г. Прышлося праэкт яшчэ перараскладаць, бо ў Маскве зноў унесена ў яго некалькі зьмен.

Канчатковы праэкт т-ва „Тепло и Сила" прадставіла «Лесбелу» і ў Маскву 22 лютага ўжо 1928 г. У Маскве ён разглядаўся 15 сакавіка і вось...

Пазаўчора атрымана паведамленьне, што праэкт не зацьверджан і яго зноў прыдзецца пераапрацоўваць.

Калі ён будзе перароблен і ці ня прыдзецца гэты праэкт яшчэ некалькі разоў перарабляць, сказаць мы не бярэмся, а толькі...

Пабудова камбінату будзе каштаваць куды больш 4, а можа і 4 з паловай міліёнаў.

Ня лепш справа і з заводам „Дрэваапрацовачнік".

Другой буйнай работай „Лесбела" зьяўляецца поўнае пераабсталяваньне менскага заводу «Дрэваапрацовачнік».

Калі тут, у сябе пад носам, дык вы думаеце, што і справа лепш?

Памыляецеся, дарагі чытач!

Папершае, крыху гісторыі.

«Лесбел» нават і ня меркаваў правадзіць тут гэткае капітальнае будаўніцтва. Плянам прадугледжвалася толькі пракладка шырокакалейнага чыгуначнага шляху.

— Навошта вам шырокакалейка, лепш займіцеся капітальным пераабсталяваньнем,—сказалі «Лесбелу» у прампляне ВСНГ БССР.

— Можна... Гэта нам раз плюнуць, толькі грошыкі.

Ну, і далі летась «Лесбелу» дазвол пачаць пабудову новага будынку і поўнае пераабсталяваньне заводу. Нават і суму вызначылі ў 120000 р.

Такім чынам, новы корпус для сталярна-мэбл. цэху быў пабудаваны яшчэ летась.

А як жа з праэктам, каштарысам? Ды так: цішэй едзеш—далей будзеш...

Толькі 14-III 1928 г. гэты праэкт быў зацьверджан, і сёлета трэба будзе яшчэ затраціць на будаўнітва 275000 руб., што ўжо і адпушчана.

Як бачыце, 120000 р. і 275000 разам будзе ўжо каля 400000 р.

А вы кажаце, што будаваць ня ўмеем, што размаху ў нашых гаспадарцаў няма. Калі ласка, апошняга ў іх хапае, а вось адносна гаспадарнасьці, дык выбачаце...

Колькі будзе каштаваць будаўніцтва заводу «Дрэваапрацовачнік», мы сказаць не бярэмся, але «Лесбелаўская» практыка лепш за ўсё гаворыць за сябе...

Па нашай-жа думцы, гэткае будаўніцтва—не будаўніцтва, а звычайнае галавацяпства, за якое вінаваты, хто-б яны ні былі, павінны панесьці суровую кару.

В. З—ў.

ЗРЫЎ БУДАЎНІЧАГА СЭЗОНУ МОЖА АКАЗАЦЦА РЭАЛЬНАСЬЦЮ.

З наступленьнем будаўнічага сэзону ўсе арганізацыі рыхтуюцца да будаўніцтва, але рыхтуюцца нарознаму. У некаторых галінах будаўніцтва, як, напрыклад, у прамысловым будаўніцтве, бывае так: загадала начальства будаваць—і будуй баз ліпніх гутарак, а ня будзеш будаваць—здымуць з пасады, а тады хацеў-бы будаваць, ды няма чаго.

У прамысловым будаўніцтве ў сувязі з гэтым і справа стаіць лепш. А вось там, дзе за «будаўніцтва» ці за «падрыхтоўку» да яго самому «заву» трэба скарачаць са службы сябе, дрэнныя справы. Там сумнае будаўніцтва. Гэта можна сказаць пра НК Аховы Здароўя (адносна пабудовы клінікі для нэрвовых хворых) і пра НК Асьветы, які будуе Унівэрсытэцкі Гарадок.

Як тут будаўніцтва можа быць нармальным, калі непадрыхтаваны матар'ялы, або, яшчэ горш, невядома, на якім месцы будаваць.

Саюз харчавікоў узяўся будаваць клюб. Склікаў спэцыялістаў-архітэктараў з Масквы, а будаваць невядома як, бо няма ўсіх праэктаў, невядома дзе будаваць і, урэшце, невядома, хто будзе весьці будаўнічыя работы. Цяпер усё разам: будаваць, складаць праэкты, хадзіць да загадчыка камгасу прасіць, каб даў пляц, гаварыць з „Белгосстроем", каб узяўся будаваць, вазіць матар'ялы, трымаць без работы архітэктара і г. д. А хто за гэта будзе адказваць? Ну, зразумела, будаўнічы індэкс, бо каб «заў» адказваў, гэтага ня было-б.

Вынікам такой „падрыхтоўкі" да будаўніцтва зьяўляецца: спазьненьне, недахват 3 міліёнаў цэглы, адсутнасьць праэктаў, недахват жалеза і, урэшце, „зьніжэньне" будаўнічага індэксу, аб якім будзе гутарка толькі пасьля каляд.

Зараз будаўнічы індэкс зьніжае толькі «Белгосстрой». Прыбыткі зьменшыў ад 5 да 2 проц. Побач з гэтым зьмяншаюцца і накладныя выдаткі. А вось Белдзяржстрах і ня думае паменшыць страхоўку, як гэта яму прапануюць адпаведныя дырэктывы вышэйшых органаў. „Кошт матар'ялаў" прамысловасьць зьніжае слаба, а па некаторых матар'ялах зусім ня зьніжае. Так, лесаматар'ялы сёлета, як і летась, распэнваюцца па 1 р. 11 кап. за куб. фут, а «Лесбел» і ў вус ня дуе.

Аб пабудове цэмантных заводаў у Беларусі мы пішам і пішам шмат, а па цэмант езьдзім у Новарасейск і за перавозку адной бочкі плацім столькі, колькі каштуе бочка цэманту на заводзе.

Нават такая рэч, як пясок, якога ў Беларусі залішне многа, і то летась абходзіўся 12 руб., а сёлета—19 руб. куб. сажань. Гэта, бачыце, таму, што Менскі камгас дапамагае «зьніжаць» будаўнічы індэкс і на карысьць мясцовых прыбыткаў накінуў на кубічны сажань пяску па 3 р. 50 кап.

Дзе-ж тут будзе зьніжэньне будаўнічага індэксу на 15 проц.? Добра было-б, каб хоць на 6-8 проц. і то за рахунак... зьмяншэньня прыбыткаў «Белгосстроя».

Пакуль адказнасьць за будаўніцтва ня ляжа на асоб, пакуль яна будзе ляжаць на арганізацыях ды на „аб'ектыўных" прычынах, нічога добрага ня будзе. Трэба, каб за кожны недагляд і няўважлівыя адносіны да справы адказваў той, хто загадвае, тады ўсё будзе загадзя прадугледжана, падрыхтована і зроблена.

Трэба, каб у канцы будаўнічага сэзону было менш «аб'ектыўных» прычын, а больш індывідуальнай адказнасьці.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

КРЭДЫТАВАНЬНЕ БЫЛЫХ ЧЫРВОНЫХ ПАРТЫЗАНАЎ.

Бабруйск, 20-3. Акруговае сельска-гаспадарчае крэдытнае таварыства атрымала з Менску 20000 руб. спэцыяльна на крэдытаваньне гаспадарак былых чырвоных партызан і чырвонаармейцаў. Крэдыт гэты доўгатэрміновы і будзе выдавацца на тых-жа ільготных умовах, што і з фонду беднаты.

Ворша, 21-3. Сёньня мясцовае акруговае сельска-гаспадарчае крэдытнае таварыства атрымала з Белсельбанку 10.000 руб. спэцыяльна для ільготнага крэдытаваньня гаспадарак былых чырвоных партызанаў і чырвонаармейцаў.

ПАБУДОЎКА НОВАГА ЗАВОДУ С.-Г. МАШЫН.

Гомель, 21-III. Пасьля дакладнага вывучэньня месца для пабудовы новага с.-г. заводу, прэзыдыум акрвыканкому пастанавіў будаваць завод не ў Новабеліцы, як раней меркавалася, а ў Гомелі. Прызначаны ў Гомелі вучастак дае магчымасьць для далейшага разьвіцьця заводу. На вучастку маюцца гатовыя баракі, якія могуць быць прыстасаваны для будаўнічых і заводзкіх патрэб на першы час. Вучастак [illegible] выгункі. Ап-[illegible] дана-[illegible]

ЛЕТНЯЕ БУДАЎНІЦТВА Ў ГОРАДЗЕ.

Бабруйск, 21-3. Усяго на летняе будаўніцтва ў гор. Бабруйску будзе патрачана 472.258 руб.

На пракладку чыгунных водаправодных труб (на працягу 8600 пагонных мэтраў), на ўстаноўку 33 пажарных гідрантаў і 50 водаразборных калёнак, на загатоўку шчотчыкаў і інш. будзе патрачана 220.000 руб.

На новае будаўніцтва будзе патрачана 162.697 руб. 30 тысяч рублёў з гэтай сумы будзе патрачана на дабудоўку другіх паверхаў на каменных аднапавярховых дамах.

132.697 руб.—на пабудову трохпавярховага дому.

Каля 28.000 руб. будзе патрачана на капітальны і дробны рэмонт дамоў і г. д.

30 тысяч руб.—на капітальную перабудову і пашырэньне гарадзкой лазьні.

50 РАБОЧЫХ—ЗАСЯДАЦЕЛІ Ў БЮРО СКАРГАЎ.

Гомель, 21-III. АБК РСІ, ажыцьцяўляючы дырэктыву XV зьезду партыі і пастанову пленуму ЦКК РСІ БССР аб большым уцягненьні ў практычную працу РСІ рабочых ад варстату, арганізоўвае інстытут выбарных засядацеляў у бюро скаргаў па разгляду паступаючых скаргаў, заяў і інш. [illegible] ад варстату будуць [illegible] ў удзел у працы бюро [illegible] прымаць заявы, скар-[illegible] правільнасьці [illegible]

7.000 РУБ. НА ПАЛЕПШАНЬНЕ СТАКОВІШЧА ДЗІЦЯЧЫХ УСТАНОЎ МЕНШЧЫНЫ.

Цэнтральная Дзіцячая Камісія пры ЦВК БССР адпусьціла 7.000 руб. дзіцячым установам Менскай акругі. Гэтыя грошы ўжо разьмеркаваны паміж 14 дзіцячымі ўстановамі і дадуць магчымасьць палепшыць іх матар'яльнае становішча.

РОСТ ЯЧЭЕК ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ.

Гомель, 19-3. Па акрузе разгарнулася шырокая праца па арганізацыі ячэек Чырвонага Крыжу. Зараз па акрузе налічваецца 79 ячэек з колькасьцю сяброў у 2.500 чал. Нядаўна арганізован яшчэ 1 райённы камітэт і 10 новых ячэек.

РАЗЬВІЦЬЦЁ МАЛОЧНАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Ворша, 21-3. Малочная кантора Сельсаюзу працуе з 1926 г. У сучасны момант кантора шырока разгарнула сваю дзейнасьць. Так, зараз працуюць 25 масларобных і сыраварных т-ваў. За апошні год канторай рэалізавана 42.000 кілё масла і 7.000 кілё сыру.

АРГАНІЗАЦЫЯ 10 НОВЫХ ПТАШНІЦКІХ Т-ВАЎ.

У часе вясеньняй пасяўной кампаніі па Менскай акрузе будзе арганізавана 10 новых пташніцкіх т-ваў.

Апошнія будуць арганізаваны ў 7 райёнах акругі. Усяго такім чынам па акрузе будзе існаваць 12 пташніцкіх т-ваў.

НОВЫЯ САДОВА-ГАРОДНЫЯ Т-ВЫ І КАЛЕКТЫВЫ.

У бягучым 1927-28 гаспадарчым годзе, згодна пастановы Менскай акруговай плянавай камісіі, будзе арганізавана па Менскай акрузе тры садова-гародныя т-вы. Апроч гэтага, будзе арганізавана 2 садова-гародныя калектывы ў Сьмілавічах і Копылі

[illegible] б. ЗАПАЗЫ-[illegible]ці.

[illegible] 1-ае студзеня [illegible]ка-гаспадарчай [illegible] лічылася за [illegible]ваных пазык [illegible]ошніх даных [illegible] складаецца ў [illegible], за час кам-[illegible]уб. Прымаюц-[illegible]ня запазыча-[illegible]

1-ая ўсебеларуская выстаўка сельскай гасп. і прамысловасьці

Першая ўсебеларуская выстаўка сельскай гаспадаркі і прамысловасьці будзе адчынена ў Менску ў 1930 годзе на 2 месяцы. Яна мае на мэце ўсебакова высьветліць стан сельскай гаспадаркі і прамысловасьці БССР, дасягненьні ў галіне сацыялістычнага разьвіцьця і перабудовы сельскай гаспадаркі і прамысловасьці, а таксама рэарганізацыі масавай сялянскай гаспадаркі. Выстаўка павінна выявіць прыродныя багацьці краіны і ўсе нацыянальна-бытавыя асаблівасьці ў разьвіцьці мясцовай народнай гаспадаркі, а таксама дасягненьні і пэрспэктывы навукова-дасьледчай працы ў гэтых галінах. Разам з гэтым выстаўка пашырыць эканамічную сувязь з саюзнымі рэспублікамі і з прадстаўнікамі замежных дзяржаў; яна намеціць далейшы шлях і пэрспэктывы разьвіцьця сельскай гаспадаркі і прамысловасьці БССР; выстаўка дасьць магчымасьць азнаёміць шырокія масы працоўных Савецкай Беларусі і іншых частак Саюзу з дасягненьнямі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці БССР і з навуковымі мэтадамі вядзеньня сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.

У выстаўцы будуць удзельнічаць: дзяржаўныя, каапэрацыйныя, грамадзкія, прафэсійныя ўстановы, арганізацыі і прадпрыёмствы БССР, індывідуальныя сялянскія гаспадаркі, паасобныя навуковыя працаўнікі, дасьледчыкі, вынаходцы ў галіне сельскай гаспадаркі і прамысловасьці БССР. Экспанаты з іншых саюзных рэспублік і замежных дзяржаў будуць удзельнічаць на выстаўцы па спэцыяльных запрашэньнях галоўнага выставачнага камітэту.

Выстаўка будзе складацца з наступных аддзелаў: навукова-асьветнага, сельска-гаспадарчай і лясной дасьледчай справы, расьлінаводзтва, жывёлагадоўлі, лясной гаспадаркі, буйнага земляробства, сельска-гаспадарчай каапэрацыі і калектыўных гаспадарак, землябудаўніцтва, калёнізацыі, меліярацыі, сельскага будаўніцтва, буйнай прамысловасьці і г. д.

На выстаўцы маюць быць абвешчаны вынікі ўсебеларускага конкурсу на лепшы райён па сельскай гасп.

У пэрыяд функцыянаваньня выстаўкі для агляду апошняй будуць арганізаваны экскурсіі, удзельнікі якіх атрымаюць скідку на праезд па чыг

Да рэформы беларускага правапісу.

Пасьля году з лішкам перапынку ў Лібскульце зноў распачалася праца на справе рэформы беларускага правапісу. У арганізаваную дзеля гэтага камісію ўвайшлі: С. Некрашэвіч, Язэп Лёсік, Янка Купала, прафэсар Бузук, пэдагогічны сакратар прэзыдыуму ІБК т. Ластоўскі, т. Чаржынскі, т. Бялькевіч і т. Багдановіч.

Згодна дырэктыў, камісія павінна скласьці свой праэкт рэформы беларускага правапісу да 1-га ліпеня г. г. на наступных разьдзелах: 1) правапіс галосных, 2) правапіс зычных, 3) правапіс морфолёгічных форм, 4) правапіс складаных слоў, 5) правапіс чужаземных слоў, і 6) правапіс уласных імёнаў.

На першых пасяджэньнях камісія распрацавала правапіс галосных і часткова зычных. Найбольш спрэчным пытаньнем зьяўляецца правапіс ненаціскного „е", адносна якога камісія прышла да некаторай пагоджанасьці. Ухвалена ў агульных рысах наступная пастанова: прызнаць у беларускай літаратурнай мове існаваньне двух «е»—націскнога і ненаціскнога. Правапіс націскнога «е» зразумелы. Што-ж датычыцца ненаціскнога «е», то тут камісія ня прышла да поўнай згоды, і пытаньне лічыцца адчыненым.

Паколькі, аднак, пытаньне аб фіксацыі ў беларускай мове двух „е" зьяўляецца новым, бо адносна гэтага пытаньня ні ка акадэмічнай канфэрэнцыі, ні ў ранейшай літаратуры ня было гутаркі, трэба больш падрабязна спыніцца на ненаціскным «е», маючы на ўвазе, што па гэтым пытаньні ў парадку дыскусіі выкажуцца і іншыя зацікаўленыя асобы.

Што-ж датычыцца самай правапіснай камісіі, то тут выяўлены дзьве асноўныя групоўкі. Адна група лічыць, што ў правапіс «е» ўваходзіць морфолёгічны прынцып, што «е» трэба адзначыць аднэй літарай «е», ненаціскное „е" звычайнай літарай, а націскное той жа літарай «е» в націскам, як гэта зрабіў Тарашкевіч.

Другая група лічыць, што фіксацыя ў беларускай мове двух „е" яшчэ не дае падставы прыстасаваць да правапісу «е» морфолёгічны прынцып. Надварот, тут поўнасьцю павінен быць захован фонэтычны прынцып, бо націскное і ненаціскное «е»—гукі розныя. Першае «е»—гэта выразнае «е», другое, ненаціскное—рэдукаваны галосны, які больш падыходзіць да „я" (ці да «і»), чым да «е», а таму азначэньне ненаціскного «е» праз «е» ня будзе адпавядаць законам беларускай мовы ні літаратурнай, ні народнай. Вось чаму другая група прапануе азначыць ненаціскное «е» праз «е» (эпсылён), тым больш, што такі значок вялікай навіны складаць ня будзе, а ў той жа час дасьць магчымасьць ня зьмешваць націскное «е» з ненаціскным (гэтага не дазволіць выгляд літары).

Такім чынам, увёўшы эпсылён на месцы этымолёгічнага ненаціскного „е", другая група даводзіць, што гэтым значна спросьціцца і ўдакладніцца правапіс, які наблізіцца да жывога вымаўленьня.

Неабходна рэгуляваць.

(Аб парадку размеркаваньня валакна).

Пытаньне бесперабойнай дастаўкі валакна для беларускіх фабрык і заводаў зьяўляецца адным з актыўнейшых, да якога належыць адносіцца сур'ёзна і ўдумчыва.

На Управу Дзяржгандлю Беларусі ды іншыя арганізацыі ўскладзена заданьне як па экспорту, так і па абслугоўваньні савецкай прамысловасьці. Калі-б справа ішла выключна аб абслугоўваньні беларускай прамысловасьці і аб экспорце, то ў межах магчымасьці ў адносінах валакна можна было-б гэта заданьне выканаць на ўсе 100 пр., але справа ў тым, што на Управу Дзяржгандлю Беларусі таксама ўскладзена заданьне абслугоўваць фабрыкі і заводы па за межамі Беларусі, у сувязі з чым утвараецца вельмі цяжкае становішча.

Паўстае пытаньне—хто ў першую чаргу мае права на валакно: ці трэба яго найперш экспартаваць, ці накіроўваць лён і кудзелю на беларускія фабрыкі, ці па фабрыкі РСФСР па заданьнях ільна-пяньковага камітэту? Такое-ж становішча і з пянькой.

Вось усе гэтыя пытаньні да апошняга часу яшчэ канчаткова ня вырашаны.

Няма сумненьня, што беларускія фабрыкі неабходна забясьпечыць патрэбнай сыравінай, прычым сыравіна гэта павінна дастаўляцца самая лепшая і стандартная. Адначасова з гэтым экспартуючыя арганізацыі павінны выконваць экспортныя заданьні, а пасьля гэтага валакно павінна накіроўвацца ў іншыя прамысловыя цэнтры Саюзу.

Нар. Кам. Гандлю мусіць аддаць гэтым пытаньням максымум увагі і ўтварыць такія ўмовы, пры якіх можна было-б здаволіць, па магчымасьці, усіх.

Леўскі.

Дзе знаходзіцца Слуцак?

Думаў я да гэтага часу, што Слуцак знаходзіцца ў Беларусі. Але ма' быць я мыляўся. Знаходзіцца ён нешта зе-небудзь каля Архангельску ці каля Тамбову, але не ў Беларусі.

Адбываўся ў нас 18 сакавіка мітынг. Гаварылі многа на расейскай мове, а потым на польскай, яўрэйскай і нават па нямецкай. Стаяць усе, слухаюць і чакаюць, калі будуць гаварыць пабеларуску. Чакалі, чакалі—і не дачакаліся. Вышаў і загадчык АПА райкому і сказаў:

«Митинг считаю оконченным».

Ну, што вы цяпер скажаце? Няпраўду я кажу, што Слуцак не ў Беларусі, а недзе каля Архангельску. Недарма нейкі вясковы хлапчук сказаў: «Вось табе і Беларусь, а пабеларуску нівочо... не сказалі». А мо' ня было каму гаварыць пабеларуску? Было, чаму не! А калі і сэкратар раймясцкому працасьветы і сам загадчык культсправамі РВК забыліся на гэты час беларускую мову, то што гаварыць аб іншых. Відаць, усе думаюць, што пабеларуску на мітынгах няпрыстойна гаварыць.

Пажывем—пабачым. Можа праз гадоў 10-15 пачуем родную мову і на мітынгах.

Чуўшы.

Зембінскія бюракраты.

(Па матар'ялах НК РСІ).

Зембінскае лясьніцтва так „запрацавалася", так заблудзіла сярод лясоў, што нават, мусіць, забылася, дзе яно знаходзіцца.

Добрыя людзі! Не шкадуюць паперы, дзяржаўных грошай і...рабочых.

Весь што робіцца ў Зембінскім лясьніцтве.

У жніўні 1926 году Зембінскае лясьніцтва звольніла з працы вартаўніка сваёй канцылярыі Шнэйдэра. Вартаўнік Шнэйдэр, як незаконна звольнены, паскардзіўся ў суд, і суд прысудзіў у яго карысьць 109 р. 96 к. Пасьля звальненьня з працы Шнэйдэра на пасаду вартаўніка была прынята гр-ка Скалік, якую адміністрацыя лясьніцтва ў жніўні 27 г. таксама незаконна звольніла. У карысьць гр. Скалік суд прысудзіў 101 р. 89 к. Пасьля звальненьня Скалік на службу быў прыняты нейкі гр. Жуковіч, але яго прышлося праз некаторы час звольніць таму, што суд аднавіў на працы Скалік. Паколькі Жуковіча звольнілі, яму таксама выдалі выхадную дапамогу.

Невядома, што трэба Зембінскаму лясьніцтву: ці прыгожы твар, ці добры працаўнік. Грошы ляцяць, як шчэпкі: толькі па пастанове суду трэба выплаціць 210 руб., а выхадныя...

16 студзеня г.г. гр. Скалік ізноў звольнена з працы.

„Пайшла пісаць губэрня". У выніку—атрымалася пэлан кіпа паперы, паразгаі чыноўніцкімі рэзалюцыямі.

Калі-б НК РСІ ня ўзяўся за гэту справу, то Зембінскае лясьніцтва і далей звальняла б з працы вартаўнікоў і гэтым самым біла б на кішэні дзяржаву.

Мы ўпэўнены, што НК РСІ ўважліва разьбярэ гэту справу і вінаватых пакараюць належную адказнасьць.

Практычныя мерапрыёмствы да разьвіцьця кіно ў БССР

Калегія Наркамасьветы заслухала справаздачу аб дзейнасьці Белдзяржкіно, прычым, як дасягненьне ў працы, адзначыла наступнае:

Значна павялічылася кіно-сетка ў горадзе і ў вёсцы, зьніжана цана на вясковы пракат, палепшыўся клюбны пракат, выпушчаны ўласныя фільмы, пераважна на нацыянальныя тэмы, і ўтвораны групы сцэнарыстаў з беларускіх пісьменьнікаў.

У далейшай сваёй працы Белдзяржкіно, у першую чаргу, павінна ажыцьцявіць:

У далейшым дзейнасьць Белдзяржкіно павінна быць скіравана, галоўным чынам, на вытворчасьць карцін на нацыянальныя тэмы (пры захаваньні іх рэвалюцыйна-клясавага зьместу).

Калегія НКА даручае Белдзяржкіно пашырыць групу сцэнарыстаў з беларускіх пісьменнікаў, распрацаваць тэматычны плян вытворчасьці з напярэднім абгаварэньнем яго савецкай грамадзкасьцю, арганізаваць конкурс на лепшае лібрэта сцэнарыя беларускага быту, прыцягваючы да гэтага арганізацыі беларускіх пісьменьнікаў.

Побач з абсталяваньнем кіно-фабрыкі ў Ленінграде, калегія даручае Белдзяржкіно паступова пачаць надрыхтоўку да пабудовы ўласнай фабрыкі на тэрыторыі БССР.

Калегія лічыць першачарговай задачай Белдзяржкіно вылучэньне свайго рэжысэра з урадженцаў Беларусі, для чаго Белдзяржкіно павінна вызначыць дзьве-тры стыпэндыі ў Маскоўскім кіно-тэхнікуме для студэнтаў Беларусі і ўстанавіць пры вытворчасьці карцін практыкантаў.

Белдзяржкіно павінна выдзеліць стыпэндыяльны фонд у суме да 10.000 р. на заказ сцэнарыяў з жыцьця Беларусі.

У далейшым неабходна павялічыць колькасьць кіно-тэатраў у найбольш буйных райённых цэнтрах, мястэчках і заштатных гарадох як па лініі Белдзяржкіно, так і па лініі выкарыстоўваньня мясцовай ініцыятывы. Белдзяржкіно павінна і далей адпускаць клюбам карціны на пракат на льготных умовах, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на прасоўваньне ў клюбы культурных хранікальных і мульціплікацыйных фільмаў і адначасова весьці барацьбу супроць ператварэньня клюбаў у камэрцыйныя тэатры.

Калегія лічыць неабходным рэарганізаваць адзін з менскіх кіно-тэатраў у дзіцячае кіно.

Т. т. Галкіну і Вансоўскаму даручана распрацаваць пытаньне аб надрыхтоўцы кваліфікаваных кіно-механікаў.

Пастаноўлена таксама абавязаць Белдзяржкіно пускаць карціны ў горадзе з надпісамі на беларускай і расейскай мовах, зьвярнуўшы ўвагу на якасьць беларускай мовы; карціны, што набываюцца спэцыяльна для вёскі, павінны мець надпісы толькі на беларускай мове.

Калегія НКА даручыла Белдзяржкіно павялічыць фонд карцін вясковага пракату як з ліку набываемых у СССР, так і замежных, галоўным чынам, навукова-папулярнага характару.

Кіно-абслугоўваньне вёскі паступова трэба пераводзіць на самаакупаемасьць і перадаць райвыканкомам, пры чым захаваць і надалей весьці бясплатнае абслугоўваньне батрыкоў і беднаты.

У справе пашырэньня вясковай кіносеткі трэба трымаць курс на ўстанаўленьне на бліжэйшы год ня менш 2-х перасовак на кожны райён, выкарыстоўваючы ініцыятыву саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, пэф-таварыстваў, каапэрацыі і інш. арганізацый.

Праца кіно-перасовак у вёсцы павінна быць увязана са ўсёй сыстэмай асьветнае працы. Інспэктару масавай працы НКА даручана выпрацаваць практычныя ўказаньні аб мэтадах і зьместе палітыка-асьветнае працы пазаўковых кіно-карцін.

Хроніка.

У АЎТАДОРЫ.

Рост ячэек Аўтадору.

За час свёй дзейнасьці Аўтадор арганізаваў у Менску 22 ячэйкі, з якіх на фабрыках і заводах—9, ва ўстановах—11 і ў вайсковых часьцях—2. Гэтыя ячэйкі аб'ядноўваюць 720 чал.

Эканамічнае вывучэньне дарог БССР.

Дарожная сэкцыя Аўтадору пастанавіла ў бліжэйшы пэрыяд прыступіць да эканамічнага вывучэньня важнейшых дарог БССР.

Мэта вывучэньня—высьветліць эканамічнае значэньне дарог у сэнсе грузаавароту, руху па іх і інш.

Арганізацыя Менскага акруговага аддзяленьня Аўтадору.

Пядаўна адбыўся агульны сход сяброў менскіх ячэек Аўтадору, на якім было пастаноўлена арганізаваць Менскае акруговае аддзяленьне Аўтадору.

Абрана камісія, якой даручана правесьці ўсе арганізацыйныя мерапрыёмствы.

30.000 руб. на земляўпарадкаваньне яўрэяў.

Праўленьне Бэлсельбанку адпусьціла акругам дадаткова 30000 руб. на крэдытаваньне земляўпарадкаваньня працоўных яўрэяў.

339.000 руб. на дарожнае будаўніцтва.

На дарожнае будаўніцтва ў Меншчыне сёлета будзе затрачана 339 000 руб., з іх 180.000 руб. па мясцовым бюджэту і 90000 руб.—з субвэнцыйнага фонду.

150.000 руб. на пабудову паштамту ў Негарэлым.

Нар. Кам. Пошт і Тэлеграфаў СССР уніёс у каштарыс бягучага году 150.000 р. на пабудову паштамту пры ст. Негарэлае.

Алесінскі завод выпрацуе 15.000 пуд. крахмалу.

Алесінскі завод Мясцэльпрому мае выпрацаваць сёлета 15.000 пуд. крахмалу на суму 44 083 руб. Завод апрацуе 100.000 п. бульбы.

Экспорт крахмалу за межы.

Белсельтрэст экспартуе за межы 5 вагонаў крахмалу, з якіх 2 вагоны ў Фінляндыю і 3 вагоны ў Нямеччыну.

Трэба адзначыць, што беларускі крахмал карыстаецца за межамі вялікім посьпехам.

100.000 пуд. жыта для кантрактацыі ільну ў БССР.

Упаўнаважаны Белсельсаюзу падпісаў дагавор з Цэнтрасаюзам на паставку апошнім 100.000 пуд. жыта для кантрактацыі ільну ў БССР у бягучым годзе. Цэнтрасаюз ужо прыступіў да адпраўкі паказанай колькасьці жыта, якая паступіць на мейсца ў бліжэйшыя дні.

Плата за праезд на аўтабусах зьмяншаецца.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму АВК была разгледжана зьмочная праграма менскага аўтакіраўніцтва на 1927-28 год. Згодна гэтай праграмы, за праезд на аўтабусах устанаўляецца скідка ў 15 проц. для калектываў рабочых і служачых, а таксама для асобных сяброў саюзу, прычым гэта скідка будзе даваца толькі тады, калі асобы куплюць адразу ня менш 15, а калектывы—ня менш 50 білетаў.

Устаноўлены наступныя міжгародніх маршруты: Менск—Сьмілавічы—Чэрвень—Бярэзіна з тарыфамі:—да Сьмілавіч—2 руб., да Чэрвеня—3 руб. 50 кап. і да Бярэзіны—5 рублёў; Менск-Астрашынкі Гарадок з платай 1 руб. 25 кап., Зембін—Барысаў—за 1 руб. 25 кап.; Барысаў-Плешчаніцы—за 3 руб. 50 кап.

Прэзыдыум запрапанаваў аўтакіраўніцтву ўстанавіць пробны маршрут у Менску па лініі Ляхаўка—плян Волі—Кальварыя. Апроч гэтага, аўтакіраўніцтву запрапанавана наблізіць аўтабусны рух да насяленьня праз павялічэньне руху, расклейку на гораду тарыфаў, маршрутаў і праз набудову будак-станцый. Разам з гэтым аўтакіраўніцтва будзе распрацоўваць пытаньні аб магчымасьці выдачы насяленьню месячных абанэмэнтаў і аб прэміраваньні шофэраў за эканомію бензыны і інш.

Інспэкцыі мясцовай гаспадаркі даручана распрацаваць пытаньне аб магчымасьці арганізацыі ў горадзе і на міжгародніх лініях таварнага аўтамабільнага руху.

Падрыхтоўка да 9-га зьезду камсамолу.

Камсамольцы [illegible] Беларусі вядзе падрыхтоўку да 9-га зьезду, які адбудзецца ў красавіку.

Падрыхтоўка да зьезду ідзе па двух напрамках: праз насьценныя газэты і нарады актыву. У насьценных газэтах падрабязна высьвятляецца праца камсамолу і абгаварваюцца пытаньні зьезду. Нарады актыву праводзяцца разам з дэлегатамі, выбранымі на зьезд.

Лёгкадумнасьць Чырвонага Крыжу.

Цэнтральны Камітэт Беларускага Чырвонага Крыжу гэтымі днямі выдаў кніжку: «D-r Marcus Maier. Repe иториум ушных болезней. Перевод в немецкого издания 21 года. Под редакцией проф. Бурака».

Напершае, неяк дзіка выглядае, калі Беларускі Чырвоны Крыж замест папулярных масавых беларускіх кніжак па гігіене і здароўю, выдае на расейскай мове ды яшчэ „репетиториум" для вушных спэцыялістаў.

Наругое, цікава было-б ведаць, якія такія паважныя прычыны прымусілі Цэнтральны Камітэт Ч. Крыжу ўваліць 360 рублёў на выданьне гэтай кнігі? Камэрцыйныя? Каб працаць і ўзбагаціць касу Чыр. Крыжа? Пэльга невярыць, бо кніжка занадта вузка-спэцыяльная і таму мала рэнтабельная і, апроч таго, будзе прадавацца праз чужы кнігагандлёвы апарат, трацячы на гэтым 30 проц. камісійных. Урэшце-ж нядаўна мы чыталі, што Цэнтральны Камітэт Ч. Кр. «узяў курс на ліквідацыю гандлю» (гл. «Сав. Бел.» № 64).

Калі Беларускі Чырвоны Крыж ладзіць вялікі вечар на карысьць бедных дзяцей у Заходняй Беларусі, грамадзтва ідзе пасустрэчу і ў выніку чыстага прыбытку 778 рублёў ад аднаго вечара (гл. „Сав. Беларусь" № 64).

А калі палову такой сумы кіраўнікі Чырвонага Крыжу ўвальваюць на выданьне расейскай кніжкі, патрэбнай толькі вушным спэцыялістам, то грамадзтва мае права сказаць:

— Ня кідайцеся гэтак лёгкадумна прапоўным грашыма. Інакш усё гэта прыпамінае дарэвалюцыйны бюракратычны Чырвоны Крыж, але ня наш савецкі!. В.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ.

Загатоўка спорт'інвэнтару.

Вольмі своечасова пастаўлена зараз ВСФКБ пытаньне аб надрыхтоўцы к летняму сэзону для гурткоў ФК спартыўнага інвэнтару. Справа з інвэнтаром вельмі дрэнна стаіць, асабліва ў акругах. Часта трапляцца шмат сродкаў на паездкі ў Маскву ці Ленінград за спартыўнымі прыладамі.

Пралетарскае спортаб'яднаньне „Дынамо" павінна сёлета забясьпечыць усе беларускія спорторганізацыі неабходным інвэнтаром своечасова.

Акругі зараз-жа павінны выявіць патрэбны лік спорт'інвэнтару і падаць заяўкі.

Трэба таксама скарыстаць вопыт некаторых акругаў, якія робяць спорт'інвэнтар самастружным спосабам.

Спортаб'яднаньню «Дынамо» трэба па магчымасьці зьнізіць цэны на спорт'інвэнтар, а таксама прадаставіць спорторганізацыям шырокае крэдытаваньне.

Тэхнікум фізкультуры пав'нен быць у Менску.

Калегіяй Нар. Кам. Асьветы ўхвалена будаваць Беларускі тэхнікум фізкультуры зьвіць з акушэрска-фармацэўтычным тэхнікумам у Магілеве(!)

ВСФКБ зьвярнуўся па гэтым пытаньні ў СНК з дакладнай запіскай аб перагледжаньні гэтай пастановы з прычыны таго, што тэхнікум ФК ні ў якім разе ня можа быць зьвязан з іншымі арганізацыямі, а павінен працаваць самастойна і выключна ў Менску, дзе ёсьць кваліфікаваны кадр прапаўнікоў. Перакідаць-жа прапаўнікоў в Менску ў Магілеў, дзе кіраўнічага складу няма, не прадстаўляецца магчымым.

Юбілей спортгуртка клюбу «Ільліча» МБВ чыг.

Спортгурток пры клюбе „Ільліча" ў суботу, 24-га сакавіка, сыграе свой юбілей. У [illegible] гэтым у клюбе а 7-ай гадзіне ўвечары будзе наладжан вечар, прысьвечаны юбілею, з вялікай спартыўнай праграмай.

Аршанскі калектыў Рабфаку—першым.

На спаборніцтвах па стралковым спорту ў Ворша першае месца заняў 1-шы калектыў Рабфаку, другое—Акрвыканком, трэцяе—другі калектыў Рабфаку і апошняе—чытунка. Лепшым стралком аказаўся тав. Бароўскі (Акрвыканком).

Новы парадак прыёму ў прафтэхнічныя і с-г. школы.

Да гэтага часу ў прафтэхнічныя і сельска-гаспадарчыя школы прымаліся асобы, якія скончылі 4-х гадавую школу. Калегія Нар. Кам. Асьветы пастанавіла, што з пачатку наступнага навучальнага году ў прафшколы — Старасельскую, Аршанскую аб'яднаную, Слуцкую аб'яднаную, Менскую школу будаўнікоў, Клімавіцкую, а таксама ў с-г. школы—Смальянскую, Лушнянскую і Варонецкую—будуць прымацца асобы, якія скончылі поўны курс сямігодкі.

Усебеларускі зьезд тэкстыльшчыкаў.

27 сакавіка адчыняецца ўсебеларускі зьезд тэкстыльшчыкаў. У працах зьезду прымуць удзел кала 68 дэлегатаў.

33.250 пар галёш для БССР.

Нар. Кам. Гандлю заньвердзіў плян завозу галёш на сакавік; згодна плану, у бягучым м-цы Менскае аддзяленьне рэзінатрэсту атрымае 33,250 галош.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

аб узмацненьні абслугоўваньня ясьлямі работніц прамысловых прадпрыёмстваў.

Бяручы пад увагу невыстарчальнае абслугоўваньне работніц прамысловых прадпрыёмстваў фабрычна-заводзкімі ясьлямі, а таксама павольны рост апошніх, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Адлічыць на арганізацыю і ўтрыманьне ясьляў для дзяцей работніц, занятых на вытворчасьці ад 5 да 10 проц. фонду на палепшаньні быту рабочых.

Увага. Паказанае ў арт. 1-м гэтае пастановы адлічэньне робіцца, пачынаючы з балянсу на 1-е кастрычніка 1927 году.

2. Устанавіць з 1-га студзеня 1928 году ўдзел прадпрыёмстваў, у якіх працуе 100 і больш рабочых па сьпіску, які ўстанаўляецца Вышэйшым Саветам Народнай Гаспадаркі, Беларускім Цэнтральным Саветам Прафэсыянальных Саюзаў і Народным Камісарыятам Працы, у выдатках на ўтрыманьне ясьляў, абслугоўваючых выключна работніц гэтага прадпрыёмства, у разьмеры 1/4 проц. фонду заработнае платы гэтага прадпрыёмства незалежна ад таго, ці знаходзяцца ясьлі на тэрыторыі прадпрыёмства, ці па замежжы яго.

Увага. Прадпрыёмствы могуць аб'ядноўвацца для арганізацыі і ўтрыманьня агульных ясьляў.

3. Запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам пры зацьверджаньні каштарысаў мясцовых органаў аховы здароўя прадугледжваць павялічэньне сродкаў, якія асигноўваюцца на арганізацыю, утрыманьне і будаўніцтва ясьляў для дзяцей работніц, як па адпаведным фондзе мэдыцынскай дапамогі, гэтак і на мясцовым бюджэце.

4. Абавязаць акруговыя выканаўчыя камітэты, дзяржаўныя ўстановы і прадпрыёмствы, а таксама каапэрацыйныя арганізацыі прадугледжваць пры будаўніцтве рабочых жыляў і паселкаў пабудову памяшканьняў для ясьляў з тым, каб пачынаючы з будаўнічага сэзону 1928-29 году было прыступлена да выкананьня адпаведных будаўнічых плянаў.

5. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя асигнаваць сродкі на пабудову новых новых ясьляў з рэспубліканскага фонду мэдыцынскае дапамогі застрахаваным.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяковы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

г. Менск. 15 сакавіка 1928 году.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об усилении обслуживания женщин-рабочих промышленных предприятий.

Принимая во внимание недостаточное обслуживание работниц промышленных предприятий фабрично-заводскими яслями, а также медленный рост последних, Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Отчислить на организацию и содержание яслей для детей работниц, занятых в производстве, от 5 до 10 процентов фонда по улучшению быта рабочих.

Примечание. Указанное в ст. 1 настоящего постановления отчисление производится, начиная с баланса на 1 октября 1927 года.

2. Установить с 1 января 1928 года по участие предприятий, в которых работает 100 и больше рабочих, по списку, устанавливаемому Высшим Советом Народного Хозяйства, Белорусским Центральным Советом Профессиональных Союзов и Народным Комиссариатом Труда, расходах на содержание яслей, обслуживающих исключительно работниц данного предприятия, в размере 1/4 проц. фонда заработной платы этого предприятия, независимо от того, находятся ли эти ясли на территории предприятия или вне его территории.

Примечание. Предприятия могут объединяться для организации и содержания общих яслей.

3. Предложить окружным исполнительным комитетам при утверждении смет местных органов здравоохранения предусматривать увеличение средств, ассигнуемых на организацию, содержание и строительство яслей для детей работниц как по соответствующему фонду медицинской помощи, так и по местному бюджету.

4. Обязать окружные исполнительные комитеты, государственные учреждения и предприятия, а также кооперативные организации—предусматривать при строительстве рабочих жилищ и поселков постройку помещения для яслей, с тем, чтобы, начиная с строительного сезона 1928-29 года, было приступлено к исполнению соответствующих строительных планов.

5. Предложить Народному Комиссариату Здравоохранения ассигновать средства на постройку новых яслей из республиканского фонда медицинской помощи застрахованным.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета А. Хацкевич.

г. Минск. 15 марта 1928 г.

Рознае.

ЗА ПАРТРЭТ ІЛЬЛІЧА Ў АСТРОГ.

У пэрсыцкім Азэрбайджане, па загаду камандуючага войскамі, арыштавана некалькі чалавек за хаваньне ў сябе партрэту тав. Леніна. Сярод арыштаваных некалькі чалавек, якія служылі на дзяржаўных пасадах.

ПРОЦІГАЗАВАЯ ПРАПАГАНДА НА ЧЫГУНКАХ.

Польскае таварыства процігазавай абароны арганізавала спэцыяльны агіт-вагон, у якім ёсьць розныя экспанаты і які абслугоўваецца спэцыяльнымі лектарамі. Вагон гэты, на пагоджаньні з міністэрствам чыгунак, прызначан выключна для прапаганды ідэі процігазавай абароны сярод чыгуначнікаў.

СЫНГАПУРСКАЯ БАЗА.

Вядомы фарпост Англіі на Далёкім Усходзе—Сынгапурская база заканчваецца пабудовай. Амаль-што скончаны земляпальныя работы, пачатыя яшчэ ў 1923 годзе. Скончаны самыя цяжкія работы для прычальнага пункту, для вялікага плаўучага дока, які будаваўся ў Англіі і быў разабраным выглядзе адасланы ў Сынгапур. Вялізарныя разьмеры гэтага дока патрабавалі паглыбленьня дна на 21 мэтр (пры даўжыні ў 366 мэтраў і шырыні ў 27½ мэтры). Будуюцца аэрадром, радыё-станцыя вялікай сілы, склады для матар'ялу, вялікія бакі для гаручага. Аб велічыні дока можна судзіць ужо па адным таму, што розных машын для яго панадобіцца на 11 мілёнаў рублёў.

Апавяшчэньні.

— АПА ЦК КП(б)Б паведамляе, што заявы аб камандраваньні на будучы 1928-1929 навучальны год у інстытуты палітасьветрацаўнікоў (Маскоўскі і Ленінградзкі) будуць разглядацца ў Адборачнай Камісіі пры АПА ЦК 27 сакавіка аб 11 гадзіне раніцы.

Усе падаўшыя заявы т. т. павінны зьявіцца ў камісію к вызначанаму часу, маючы пры сабе засьведчаньні анкеты на фэрмах, разасланай Акружкомам, (калі гэткія яшчэ не адасланы ў АПА) і погляд Парткому КП(б)Б адносна пасылкі іх на вучобу.

ПРАЦЯГ СХОДУ КАМУНІСТАЎ—ЧЛЕНАЎ САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 22 сакавіка, а 7-й гадзіне ўвечары ў Доме Асьветы адбудзецца працяг скліканага АПА Менакружкому КПБ сходу камуністаў—членаў саюзу працасьветы (ячэек працасьветы, БДУ, інбелкульту, тэхнікумаў і інш.).

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У пятніцу, 23 сакавіка, кіно „Поцалуй Мери". Сэансы—у 7½ і 9½ гадзін. Пасьля кожнага сэансу выступленьні Нароўскай—выканаўцы цыганскіх песень і вядомага ленінградзкага артыста [illegible]скага—бытавы жанр. Білеты па 30 кап. а для сяброў клюбу—25 кап.

Што слухаць па радыё.

Пятніца, 23-III.

6-00—6-30 Гутарка 9-я па прыродазнаўству на тэму: „Як пабудавана і працуе доза жывёл і чалавека".
6-30—7-10 Беларуская радыё-газэта № 54.
7-10—7-40 Гутарка аграномаў на тэмы: 1) Зернаачышчаньне. 2) Што патрэбна нашаму пташніцтву.
7-40—8-10 Даклад ЦСПСБ на тэму „Роля прафсаюзу ў справе індустрыялізацыі Беларусі".
8-10—10-00 Канцэрт.

Субота, 24-III.

6-00—6-30 «Беларускі піанэр „из радио"».
6-30—7-10 Беларуская радыё-газэта № 55 (з польск. аддзел.).
7-10—7-40 Даклад на тэму: «Прыродны таварнага голаду і меры зьнішчаньня».
7-40—8-10 Гутарка 4-я з цыклю: „Вучэньне працэсу Беларускай Грамады".
8-10—10-00 Канцэрт.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

БІБЛІЯГРАФІЯ.

Практычнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня ў БССР.

Частка II. Праца сярод нацыянальных меншасьцяў. Па матар'алах нацыянальнай камісіі ЦВК БССР. Менск. 1928 году.

Да дасягнай гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі Пацкамісія ЦВК БССР выпусьціла дзьве кніжкі, якія падагульваюць нашы дасягненьні і недахваты ў справе правядзеньня нацыянальнай палітыкі як у галіне беларусізацыі, так і працы сярод нацыянальных меншасьцяў. Апошняя галіна працы сустракае асаблівы буйны цяжкасьці ў выніку з вялікай колькасьцю розных нацый, якія пражываюць на тэрыторыі маладой беларускай савецкай дзяржавы. Працоўным масам Беларусі, якія ў 1920 годзе ўзяліся за будаўніцтва БССР, трэба было выказаць належны такт і разуменьне стаячых перад ім задач, каб ні адна нацыя ня была пакрыўджана, каб ня было нацыянальнага незадаволеньня і розьні. Ці выканала БССР задачу, якая перад ёй стаяла ў гэтай галіне? Адказ на гэтае запытаньне дае кніжка, якую мы тут зьбіраемся разглядзець.

Тав. Хацкевіч у сваёй прадмове да гэтае кніжкі піша: „Вызначаючы лінію ў практычнай працы сярод нацменшасьцяў: яўрэяў, палякаў, латышоў, літоўцаў і г. д., КП(б)В указвае на тое, што праца сярод працоўных розных нацыянальнасьцяў павінна ісьці па лініі стварэньня найпячыльнейшага зьбліжэньня працоўных гэтых нацыянальнасьцяў з беларускім сялянствам, зьбліжэньня гораду і вёскі Беларусі і зьліквідаваньня нацыянальнай розьні, уцягненьня ўсіх нацыянальнасьцяў у працу над эканамічным і культурным адраджэньнем БССР.

Гэтыя задачы, высунутыя камуністычнай партыяй у практычнай працы сярод нацыянальных меншасьцяў, з посьпехам ажыцьцяўляюцца.

Што мы маем у выніку ажыцьцяўленьня гэтай палітыкі?

На вялікі жаль, кніжка складалася ня ў форме вызначэньня дасягненьняў кожнай нацыянальнасьці паасобку, а ў форме [illegible] на асобных нацыях. Чытаць, які хоча працытаць пра посьпехі ў працы сярод адной якой-небудзь нацыянальнасьці, прыдзецца шукаць гэта па ўсіх старонках кнігі. Гэта зусім слушна абяжкарвае кніжку, але ні ў якім выпадку не пазбаўляе каштоўнасьці. Мы ў кніжцы знаходзім адказ на ўсе запытаньні, якія датычацца нацыянальнасьцяў. Цэнтральнае месца ў кнізе займае яўрэйскае пытаньне, якому адведзена досыць шмат старонак. Яўрэйская нацыя, уціснутая царызмам у рамкі «черты оседлости», не знаходзіла выхаду з свайго цяжкага эканамічнага становішча. Ратунак яўрэі знайшлі ў пастанове савецкай улады аб надзеле яўрэяў зямлёю. 1519 яўрэйскіх сем'яў за 1925 і 1926 г. г. атрымалі 15 253 дасяціны зямлі, 878 сем'яў стварылі 103 калектыўныя гаспадаркі (глядзі стар 45). Кніжка дае нам поўны малюнак таго, як яўрэй у БССР зьяўляецца роўнаправным грамадзянінам, як яўрэй робіцца поўнаправным удзельнікам будаўніцтва новае гаспадаркі, новага жыцьця. Будуюцца яўрэйскія школы, сэкцыі ў выш. навуковых установах, подтэхнікумы, тэатр, літаратура і г. д.

Мы ў кніжцы таксама знаходзім досыць матар'ялу, які малюе стан польскага насельніцтва на Беларусі. На Беларусі ёсьць: 136 польскіх школ, з іх 11 сямёхгодак, у школах навучаецца 10.890 дзяцей (у польскіх і беларускіх школах), у Менску існуе польскі подтэхнікум, пры ім спэцыяльныя 2-хгадовыя курсы, у БДУ ёсьць спэцыяльная польская катэдра, існуюць польскія клюбы, хаты-чытальні, сельсаветы і г. д. На фоне тых правоў, якімі карыстаецца палякі ў БССР, проста жудасным здаецца палітыка, польскага ўраду да беларусаў у Польшчы. Хіба не на Рыскаму трактату на сёмаму пункту Польшча ўзяла на сябе абавязак «забясьпечыць асобам беларускай і іншай нацыянальнасьцяў усе правы, гарантуючыя вольнае разьвіцьцё культуры, мовы і выкананьня рэлігійных абрадаў, што яна гарантуе ў межах унутранага заканадаўства права гэтых нацыянальнасьцяў культываць сваю родную мову, арганізоўваць і падтрымліваць свае родныя школы, разьвіваць сваю культуру і стварань з гэтаю мэтаю таварыствы і саюзы». Здаецца, што гэты пункт абодны сакі ўзяліся выконваць. На вялікі жаль, да гэтага часу Польшча ня толькі ня прыймала аніякіх захадаў да яго ажыцьцяўленьня, але наадварот, пазачыняла беларускія школы, паразганяла беларускіх падгогаў, розныя школьныя таварыствы і г. д. Нават польскі афіцыёз „Эпоха" ў